BELARUS Live

# Польшча '89 – Беларусь '91
# Poland '89 – Belarus '91

## НЕРАЎНАЗНАЧНЫЯ ЗМЕНЫ
## NON-EQUIVALENT CHANGES

*Зборнік артыкулаў*

*Collection of articles*

CENTRUM STOSUNKÓW MIEDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

2009

Polska
www.poland.gov.pl

# Польшча '89 – Беларусь '91
# Poland '89 – Belarus '91

## НЕРАЎНАЗНАЧНЫЯ ЗМЕНЫ
## NON-EQUIVALENT CHANGES

*Зборнік артыкулаў*

*Collection of articles*

2009

**Польшча ’89 – Беларусь ’91: нераўназначныя змены.**
***Зборнік артыкулаў***

**Poland ’89 – Belarus ’91: Non-equivalent Changes.**
***Collection of articles***

*Гэтае выданне з’явілася ў межах праекту «Польшча напярэдадні прэзідэнцтва ў Еўрапейскім Саюзе – выклікі і шанцы. Навучальны праект для рэгіянальных беларускіх журналістаў», падтрыманага Міністэрствам замежных спраў Рэспублікі Польшча.*

*This publication has been generously supported by the Ministry of Foreign Affairs of the Republic of Poland in the framework of the project: „Poland before taking over the rotating presidency of the European Union. Threats and challenges. A training project for regional Belarusian journalists.”*

www.poland.gov.pl

Цэнтр міжнародных адносінаў
Koordynator projektu: Wojciech Borodzicz-Smoliński
Рэдакцыя / Edited by : Wojciech Borodzicz-Smoliński, Andrei Klikunou
Пераклад / Translated by: Belarus-Live.eu.

Published by:
Center for International Relations
Цэнтр міжнародных адносінаў
Emilii Plater 25, 00-688 Warsaw, Poland
Tel.: +48 22 646 52 67
Fax: +48 22 646 52 58
E-mail: info@csm.org.pl

ISBN 978-83-88216-97-8

© Цэнтр міжнародных адносінаў, 2009

## *Шаноўнае спадарства! Дарагія чытачы!*

*1989 год быў пераломным для Польшчы, таксама як 1991-ы быў пераломным для Беларусі. Тое, што аб'ядноўвае гэтыя два рубяжы, – гэта змены, якія ў іх выніку адбыліся на палітычнай мапе свету. У 1989 г. у Польшчы прайшлі «Круглы стол» і выбары ў Сейм – падзеі, якія адлюстроўвалі грамадскія спадзяванні. Перамены ў Польшчы далі таксама штуршок для разбурэння Берлінскага мура. Значэнне гэтых падзеяў было ў тым, што Польшча (і ўлада, і апазіцыя) прадэманстравала, што магчымыя мірныя перамены, увядзенне прынцыпаў свабоднага рынку, мадэрнізацыя і, урэшце рэшт, тое, чаго так чакала грамадства, – дэмакратычныя выбары і дэмакратычна абраная ўлада.*

*1991 год для Беларусі – гэта год атрымання незалежнасці і фармальнага распаду Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. З 26 снежня 1991 г. Беларусь (як і іншыя краіны былога СССР, крыху разгубленая ў новай сітуацыі, у якой яна аказалася) пачынае выбудоўваць сваю пазіцыю на міжнароднай арэне як суверэнны суб'ект міжнародных адносінаў.*

*Гэтыя дзве важныя падзеі ў гісторыі Польшчы і Беларусі схілілі нас да таго, каб у дваццатыя ўгодкі паседжання «Круглага стала» высветліць, як беларусы ўзгадваюць тыя часы. Ці задаволеныя яны пераменамі ва ўласнай краіне? Ці ўсведамляюць яны сабе значэнне падзеяў пералому 1980-х і 90-х для Еўропы і свету?*

*Каб знайсці адказ на гэтыя пытанні, мы арганізавалі конкурс для журналістаў і ўсіх тых, хто піша артыкулы і рэпартажы для розных інфармацыйных крыніцаў, якія існуюць на Беларусі.*

*У выніку конкурсу атрымалася сабраць групу, якая была запрошаная ў Польшчу. Падчас яе наведвання былі арганізаваныя сустрэчы з польскімі палітычнымі лідарамі, дэпутатамі Еўрапарламенту, прадстаўнікамі МЗС РП. Журналісты таксама мелі магчымасць правесці дыскусію з дарадцам прэзідэнта РП і наведаць Прэзідэнцкі палац. Для нас было важна паказаць не ідэальны вобраз бесклапотнай Польшчы, нібыта з карцінкі з блакітным небам. Мы імкнуліся паказаць Польшчу і той шлях, які яна прайшла з 1989 года, мы хацелі паказаць сапраўдную Польшчу. Нам, палякам, няма чаго саромецца – нават нашых рэфарматарскіх памылак, – урэшце рэшт, не памыляецца толькі той, хто нічога не робіць.*

*Мы лічылі, што пасля візіту нашыя беларускія сябры здабудуць веды пра польскі досвед, замежную і эканамічную палітыку. Мы хацелі таксама, каб беларускія журналісты ўзбагацілі свае веды пра Еўразвяз і ініцыятыву «Усходняе партнёрства».*

*Як арганізатары праграмы, мы імкнуліся выклікаць у яе ўдзельнікаў разважанні на тэму перамен, што адбываюцца ў грамадскім жыцці Польшчы і Беларусі. Мы былі вельмі задаволеныя вынікамі праекту – некалькімі дзесяткамі артыкулаў, на напісанне якіх аўтараў натхнілі веды, атрыманыя падчас сустрэчаў у Варшаве.*

*У нашым зборніку можна знайсці артыкулы, прысвечаныя палітычнай, грамадскай, адукацыйнай, рэгіянальнай і міжнароднай тэматыцы. Усе тэксты аб'ядноўвае ўвага да зменаў у Польшчы і Беларусі на працягу апошніх 20 год. Аніводнаму з аўтараў кнігі тэма артыкулу не была навязаная. Як арганізатары, мы трымаліся меркавання, што і веды, якія мелі ўдзельнікі праграмы да паездкі, і досвед, здабыты падчас азнаямляльнага візіту, дадуць штуршок нечаканым, цікавым ідэям, якія праілюструюць спосаб мыслення пра падзеі 1989 і 1991 гадоў.*

*Мы спадзяемся, што змешчаныя ў кнізе артыкулы дазволяць Вам па-новаму пабачыць Беларусь і адкрыць інтарэсы журналістаў і маладых удзельнікаў адкрытых дэбатаў.*

*Напрыканцы мы хацелі б падзякаваць усім тым, хто непасрэдна альбо апасродкавана спрычыніўся да стварэння гэтага зборніка артыкулаў. Асаблівыя словы падзякі кажам міністру замежных спраў РП і консульскім аддзелам Польшчы у Брэсце, Гродна, Мінску і Маскве. Без іх дапамогі немагчыма было б аператыўна прайсці візавую працэдуру. Дзякуем экспертам МЗС РП, якія пагадзіліся пазнаёміць удзельнікаў з усходнімі задачамі польскай замежнай палітыкі і асабліва ініцыятывай «Усходняе партнёрства». Выказваем удзячнасць кіраўніку Канцэлярыі прэзідэнта РП, які ажыццявіў сустрэчу нашых гасцей у Прэзідэнцкім палацы.*

*Адрасуем словы падзякі таксама дэпутатам, экспертам і журналістам, якія дзяліліся парадамі і ўласным досведам.*

*Жадаем прыемнага і цікавага чытання!*

***Войцех Бародзіч-Смаліньскі,***
*Цэнтр Міжнародных Адносінаў,*
***Андрэй Клікуноў,***
*www.belarus-live.eu*

## *Dear readers! Dear friends!*

*The year of 1989 was a crucial period of time for Poland, just like the year of 1991 was a turning point for Belarus.*

*These two borderlines are united with the changes they caused on the political map of the world.*

*The "Round Table"and the election to the Sejm took place in Poland in 1989. These events reflected the existing public expectations in the country. The changes in Poland gave another impulse to breaking the Berlin Wall. The Polish events were highly important, since both the government and the opposition manifested the possibility of holding peaceful negotiations, introducing the free market economy, and upgrading the fixed assets. Also, they showed the possibility of democratic voting and election of democratic government, the society was waiting for.*

*The year of 1991 brought independence to Belarus. Also, it was the year of formal collapse of the Soviet Union. Since December 26, 1991, feeling quite bewildered in the new situation, just as all other former Soviet Republics, Belarus started building up its position on the international stage as a sovereign international entity.*

*These two important events in the history of Poland and Belarus impelled us to learn how the Belarusian people recollect that period of time in the past on the 20$^{th}$ anniversary of the "Round Table" meeting in Poland. Also, it was interesting to learn if the Belarusians are satisfied with the changes in their country and whether they realize the meaning of the events at the turn of 1980-ies and the beginning of 1990-ies for themselves as well as for Europe and the world.*

*It was decided to announce a journalist contest for the media workers, who contribute articles and reports to different media outlets, exising in Belarus.*

*The contest winners were invited to Poland. The group of journalists had an opportunity of meeting a number of Polish political leaders, EP deputies as well as official representatitves from the Ministry of Foreign Affairs of Poland.*

*Moreover, the journalists had a possibility to hold a discussion with a Councillor to the President of Poland and visit the Presidential Palace in Warsaw.*

*The project organizers didn't intend to show an ideal image of troubleless Poland. The general idea was to show the real Poland and the way it has passed since 1989.*

*Actually, the Poles have hardly anything to be ashamed of, including certain errors in the implemented reforms, within the considered period. It should be underscored that only those people are never mistaken, who don't do anything at all.*

*The project initiators believed that the Belarusian journalists would acquire valuable knowledge about the Polish experience in the fields of foreign and economic policy etc. Also, it was anticipated that the Belarusian journalists would*

*be able to enrich their knowledge about the European Union and the Eastern Partnership initiative due to their participation in the program.*

*The project organizers intended to give the participants an idea of starting discussions on the issue of changes that take place in the Polish and Belarusian public life.*

*The project results were encouraging and highly satisfactory. Several dozen articles appeared due to the participants' visit and discussions in Warsaw.*

*You can find the journalists' articles, dedicated to the political, social, educational, regional, and international problematic in the book. All of them are united with particular attention to the changes in Poland and Belarus that have taken place within the recent 20 years. The authors weren't hinted the topics for their articles. The project organizers believed that the participants' initial expertise as well as the experience, obtained due to their participation in the study-visit, would evoke some unexpected and thought-provoking ideas that could illustrate the public opinion about the crucial events in the years of 1989 and 1991.*

*The project team hopes that that the collected articles will help you to see Belarus in a new way and stir up open debates with the participation of journalists and young civil activists on the subject-matter.*

*The project organizers would like to express especial thanks to everyone, who facilitated either directly or indirectly the creation of this collection of articles. In particular, we would like to express deep gratitude to the Minister of Foreign Affairs of Poland and the Consular Sections of Poland in Brest, Hrodna, Miensk, and Moscow. It wouldn't be possible to pass the visa opening procedure so promptly without their help.*

*The project team would like to express sincere gratefulness to the experts from the Ministry of Foreign Affairs of Poland, who agreed to get the participants aquainted with the Polish Eastern policy objectives as well as with the Eastern Partnership initiative. Also, we would like to express frank acknowledgement to the Head of President of Poland Office, who arranged a meeting with our guests from Belarus at the Presidential Palace.*

*Also, we would like to give thanks to the deputies, experts, and journalists, who shared their experience and provided valuable advice to the project participants.*

*Wishing you to enjoy your reading!*

*Yours sincerely,*
***Wojciech Borodzicz-Smoliński,***
*Center for International Relations (Poland),*
***Andruś Klikunou,***
*www.belarus-live.eu*

# Аўтары

**Павел Белавус –** супрацоўнік турыстычнага агенцтва, вольны журналіст, былы супрацоўнік «Радыё Рацыя», каардынатар сайта www.dzedzich.org, ініцыятар грамадскай кампаніі «Цішоткі вольных беларусаў».

**Юры Дракахруст** – палітычны каментатар і публіцыст, аналітык «Радыё Свабода». Кандыдат матэматычных навук.

**Юрась Каласоўскі** – сябар рэспубліканскай рады ГА «Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны», журналіст. У 2004–2006 гг. працаваў у Віцебскім абласным аддзяленні ГА «Фонд імя Льва Сапегі», з 2007 г. – у Магілёўскай гарадской арганізацыі ГА «ТБМ імя Францішка Скарыны» (сайт mahilou.org). Супрацоўнічае з газетай рэспубліканскага ТБМ «Наша слова». Займаецца міжкультурнымі сувязямі, гісторыяй, літаратурай і краязнаўствам.

**Аляксандр Класкоўскі** – кіраўнік аналітычных праектаў інфармацыйнай кампаніі БелаПАН (belapan.com). Журналіст з 30-гадовым стажам, палітычны аналітык. Сябар рады Беларускай асацыяцыі журналістаў. Выкладае майстар-класы сучаснай журналістыкі ў ЕГУ (Вільня). Вядзе блог на сайце найстарэйшай беларускай газеты «Наша Ніва» (nn.by).

**Ліна Новік –** студэнтка Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта, журналістка.

**Пётр Рудкоўскі** – выкладчык логікі і метадалогіі ў ЕГУ ў Вільні, магістар філасофіі і тэалогіі, аўтар кнігі «Паўстанне Беларусі», аўтар артыкулаў у часопісах «ARCHE» і «Наша вера».

**Хведар Скрайновіч** – аўтар шматлікіх тэкстаў сайта «Народныя навіны Віцебска» www.vitebsk.cc, моладзевага партала www.vitebsk4.me. Цікаўнасці: культурнае і мастацкае жыццё рэгіёна.

**Павел Усаў** – палітолаг. Палітычны аглядальнік цэнтра «Новая Еўропа», дактарант Польскай акадэміі навук. Сферы інтарэсаў – палітыка і геапалітыка ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне.

**Франц Чарнышэвіч** – публіцыст, сацыёлаг, перакладчык. Выпускнік філасофска-эканамічнага факультэта Белдзяржуніверсітэта. З 2008 г. – галоўны рэдактар інфармацыйнага сайта www.susvet.info. Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў. У вольны ад працы час – кіраўнік літаратурнага аб'яднання «Вобла» пры выдавецтве «Галіяфы» («Другі фронт мастацтва»).

**Раман Якаўлеўскі –** журналіст, палітолаг, эксперт у галіне міжнародных справаў, аглядальнік міжнароднага інтэрнэт-парталу «Wider Europe». Аўтар артыкулаў у незалежным часопісе публіцыстаў «Kontrateksty» (www.kontrateksty.pl).

**Dennis O'Harlem –** незалежны публіцыст. Асноўная тэматыка ягоных артыкулаў – інтэграцыя Беларусі ў сусветную палітычную супольнасць. Заснавальнік і шэф-рэдактар сайта OpenBelarus.org.

# Authors

**Pavel Belavus** – a tourist agency officer, a free-lance correspondent, a former journalist of "Radio Racyja", a coordinator of www.dzedzich.org Web-site, and an initiator of „T-shirts of Free Belarusians" civil campaign.

**Yury Drakakhrust** – a political commentator, a RFE/RL analyst; Ph.D. in Mathematics.

**Yuras Kalasouski –** a member of Belarusian Language Society named after Frantsysk Skaryna National Board, a journalist; an officer of Vitsiebsk Regional Branch of "Leo Sapieha Foundation" in 2004 – 2006; an officer of Mahilou City Branch of Belarusian Language Society named after Frantsysk Skaryna and a coordinator of www.mahilou.org Web-site since 2007, a correspondent of "Nasha Slova" newspaper, published by the Belarusian Language Society; deals with the problematic of intercultural relations, history, literature, and local lore.

**Aliaksandr Klaskouski –** Head of Analytical Projects Department at the BelaPAN News Agency (www.belapan.com); a journalist with 30 years of working experience, a political analyst; a member of Belarusian Association of Journalists Council; provides master-classes in Modern Journalism at the European Humanities University (Vilnius); contributes to a personal column on the Web-site of "Nasha Niva" newspaper (www.nn.by).

**Lina Novik** – a student of European Humanities University (Vilnius), a journalist.

**Peter Rudkouski** – a lecturer in Logic and Methodology at the European Humanities University (Vilnius), Master of Philosophy and Theology, the author of articles in "ARCHE" and "Our Faith" magazines.

**Khviedar Skrajnovich** – an author or numerous articles for "The People's News of Vitsiebsk" Web-site (www.vitebsk.cc) and www.vitebsk4.me Youth Web-portal.

**Paviel Usau** – a political scientist, a political observer of "Novaya Europa" Centre, working for Doctor's degree at the Academy of Sciences of Poland; deals with Politics and Geo-politics in the Eastern European region.

**Frants Charnyshevich** – a columnist, a sociologist, and a translator; graduated from the Philosophy and Economy Department at the Belarusian State University. The Editor-in-chief of www.susvet.info News Web-site since 2008. A member of Belarusian Association of Journalists. The Head of "Vobla" Literary Men's Group at the "Goliaths" Publishing House ("The Second Front of Art").

**Raman Yakauleuski –** a journalist, a political scientist, an expert in the field of International Relations, an observer of "Wider Europe" International Web-portal; an author of publications in the "Kontrateksty" Publicists' Magazine (www.kontrateksty.pl).

**Dennis O'Harlem –** an independent publicist; deals with the issue of integration of Belarus into the global political community. The OpenBelarus.org Web-site founder and Editor-in-chief.

Павел Белавус

# Варшава – Мінск: непараўнальныя параўнанні

Два сталічныя гарады – Варшаву і Мінск – раздзяляюць толькі 500 кіламетраў, між тым яны разлучаюць Польшчу і Беларусь нават не ў геаграфічных, а хутчэй у геапалітычных аспектах. Паміж краінамі па Заходняму Бугу, па лясах ды лугавых палетках пралягла мяжа Захаду і Усходу, ЕС і зусім не ЕС, дэмакратыі і яшчэ не дэмакратыі, Еўропы і чагосьці падобнага на Еўропу ды, урэшце, вузкай і шырокай чыгуначнай каляіны, якая прымушае дзве начныя гадзіны насельніцтва цягніка «Мінск-Варшава» нервова чакаць дазволу завітаць у той край, дзе, здаецца, нас чакаюць, толькі беражліва не ўсіх туды выпускаюць.

Прынамсі ў мяне, дзякуючы навучальнаму візіту пад назвай «Польшча 89' – Беларусь 91': непараўнальныя змены», арганізаванаму Цэнтрам міжнародных стасункаў, пасля тыднёвага наведвання Варшавы ды шматлікіх сустрэчаў з прадстаўнікамі незалежнай грамадскасці і афіцыйных дзяржаўных установ, склалася ўражанне, што беларусаў у складзе «адзінай Еўропы» чакаюць. Толькі чакаюць не як чыста вылізаную на вуліцах і ў дварах «квітнеючую» краіну, а як краіну, чыстую ад знявагі і паклёпу, забаронаў і дзікай хлусні, дубінак і грамадскіх страхаў.

Сталічны горад цяжка назваць адлюстраваннем усёй краіны, але ж гэтыя адміністрацыйна прывілеяваныя гарады нясуць на сабе ўвесь цяжар адказнасці за ўспрыманне краіны яе гасцямі.

Для Мінска найлепшым кампліментам ужо стандартна з'яўляецца: «Які ў вас чысты горад!», а вось беларус Саша Рыбак, пасля вяртання ў Беларусь сусветнай зоркай, назваў Мінск наогул самым чыстым горадам Еўропы. Яму лепш бачна, бо ён жа пра Еўропу, гледзячы са Скандынаўскага паўвострава, ведае значна больш, чым сціплыя местачковыя беларусы. А вось галоўную адметнасць Варшавы цяжка вызначыць: можа, гэта чыгунка, што размяшчаецца пад зямлёю і зусім раптоўна выходзіць на паверхню ўжо на ўскрайку горада, а можа, і сучасныя хмарачосы, якія суседнічаюць са сталінскім гігантам – Палацам культуры і навукі, альбо «старувка», што была пасля вайны адноўлена ў першапачатковым выглядзе. А зараз, павольна гуляючы, не можаш і ўявіць, што будынкі гэтай часткі горада пасля ўзнаўлення адзначылі нядаўна толькі паўгоддзе.

Мінск роўненька па коле двухслаёвым нашыйнікам акружылі кальцавыя дарогі, робячы на мапе сярод шматпалосных вуліцаў незаўважнымі тонкія абрысы каналізаванай Свіслачы. Між тым Варшава здаецца неабсяжнай, яе памеры ў рэальным атачэнні, нават не ўзіраючыся на мапу, здаюцца невымяральнымі. Да таго ж рака Вісла падзяляе горад на дзве вялікія часткі,

і, знаходзячыся на левым баку ад ракі, бачыш, што правая частка горада – гэта зусім іншы далёкі свет. Часткі горада зусім выпадкова злучаныя паміж сабою сямю варшаўскімі мастамі.

Асабіста для мяне Польшча – гэта краіна гандлю. Першы раз завітаўшы ў гэтую краіну, вельмі здзіўляўся вялізнай колькасці рэкламных шыльдаў пераважна жоўтага колеру з чорнымі надпісамі, якія мільгацелі як у гарадах, так і каля дарог паміж гарадамі. Нават значная частка беларусаў, якія жывуць у памежных гарадах і мястэчках, да ўваходжання Польшчы ў Еўрапейскі саюз тым і зараблялі, што вазілі на продаж цыгарэты, гарэлку, салярку, а прывозілі танныя мясныя вырабы і адзенне. У сучасных умовах варшаўскі дух гандлю, можа, стаў больш цывілізаваным і ўпарадкаваным, але застаўся сваім адметным – з кебабамі, адзідасамі, танным абуткам і стрэлкамі ў кірунку сучасных гіпермаркетаў.

Для беларусаў, якія прыязджаюць у Варшаву, абавязковым пунктам праграмы заўсёды значыцца наведванне гандлёвага цэнтра. Аб'ектыўна, на сённяшні дзень, выбар абутку і адзення ў польскай сталіцы больш разнастайны, чым у Мінску. Кожны беларус заўсёды будзе задаволена казаць, што «тут усё танней, чым у Беларусі». Гэта так толькі таму, што ў Мінску няма добра распрацаванай сістэмы зніжак і акцый з распродажамі. Таму і шукаюць беларусы, бегаючы па варшаўскіх буціках, запаветнае слова «Sale», дзе шматлікія рэчы атрымліваюцца сапраўды таннейшымі, чым у падобных крамах у беларускай сталіцы. Датычыцца гэта і харчавання, але тут дзейнічае ўжо псіхалагічны эфект адчування ўсяго таннага, бо калі гэта 10 злотых, а ў нас дзесяць тысяч рублёў, то адразу ўсе кошты робяцца малымі і лёгка ўспрымальнымі. Такім чынам адчуванне значнасці купюры ў 10 ці 20 злотых губляецца.

Шматлікія палякі, якія бывалі ў Мінску, наадварот, адзначаюць, што кошты ў мінскіх барах і рэстаранах значна меншыя, чым у варшаўскіх, таму параўнанне коштавых паказчыкаў – гэта даволі марная і суб'ектыўная справа.

У Мінску і Варшаве прыблізна жыве па 2 млн. чалавек, што складае 20 % ад агульнай колькасці насельніцтва Беларусі і каля 5 % у Польшчы. Менавіта гэта і хочацца зазначыць, бо ў Польшчы няма вялікай плыні, якая імкнецца пераехаць жыць менавіта ў Варшаву. Ёсць не горшыя за сталіцу вялікія гарады: Кракаў, Познань, Гданьск. У Беларусі ж адрозненні паміж сталіцай і абласнымі гарадамі значныя. Лепшыя ВНУ краіны, самыя высокія заробкі, перспектыўныя працоўныя пасады, вялікая разнастайнасць месцаў адпачынку – усё гэта сканцэнтравана ў Мінску.

Мінск мае шмат адрозненняў ад Варшавы, тым часам як Варшава значна адрозніваецца ад Берліна, Прагі ці Парыжа, але не трэба забывацца, асабліва беларусам, што аб'ядноўвае гэтыя цудоўныя гарады адна галоўная акалічнасць: усе разам яны складаюць твар адзінага кантынента – Еўропы.

Pavel Belavus

# Warsaw – Minsk: Incomparable Comparisons

Warsaw and Minsk, two capital cities, are separated by 500 kilometers only, but this distance separates Poland and Belarus not so much in geographic as in geopolitical aspects. Between the countries, along the Western Bug, through forests and grassland, there is a frontier between the West and the East, the European Union and something which is not the European Union at all, the democracy and the not-yet-a-democracy, Europe and something that resembles Europe, and finally between wide-gauge and narrow-gauge railroads which makes the population of „Minsk – Warsaw" train to wait nervously for two night hours for the permission to visit the land where we are expected, apparently, but not everyone is allowed to leave there.

Owing to the educational visit „Poland 89 – Belarus 91 – incomparable changes" organized by the Center for International Relations, after a week-long visit to Warsaw and numerous meetings with representatives of civil society and official agencies, at least I got the impression that Belarusians are expected within the „unified Europe". Only we are expected not as a „blooming" country where streets and courtyards are lick-clean but as a country clean from insult and slander, interdictions and wild lies, truncheons and public fears.

The capital city could hardly be called a reflection of the whole country; however these administratively privileged cities bear the burden of responsibility for the perception of the country by its guests.

It is customary now to hear the best compliment for Minsk: „What a clean city you have!", and the Belarusian Sasha Rybak, after coming back to Belarus as a global star, went to call Minsk the cleanest city in Europe. He is better placed to know, because looking from his Scandinavian Peninsula, he knows much more about Europe than modest small-town Belarusians. But the most distinctive feature of Warsaw is difficult to determine: it may be the railways which are located under the ground and surface all of a sudden at the city outskirts, or contemporary skyscrapers which neighbor the Stalin giant – the Palace of Culture and Science, or the „starówka" which was restored after the war in its original appearance. And now, taking a slow walk, you cannot even imagine that the buildings of this part of the city recently celebrated their fifty years only after the reconstruction. Warsaw's dwellers, and especially their male part, are very proud of the city arms which represent a topless mermaid. Furthermore, I noticed that manufacturers of numerous tourist souvenirs increased the size of the mermaid's breasts comparing with the classic size that she has on the famous monument on the market square in the Old Town.

Minsk is surrounded by the smooth circle of the belt highway in the form of a double-layer dog-collar which makes the fine lines of the canalized river of Svislach unperceivable on the map among its multilane streets. Meanwhile, Warsaw appears vast; its dimensions in the real environment, even without looking at the map, seem to be immeasurable. Also, the river of Vistula divides the city into two big parts, and when you are on the left bank of the river, the right part of the city looks like a totally different faraway world, and these two worlds are connected between themselves totally accidentally by seven Warsaw bridges.

Personally to me Poland is a country of trade. When I visited this country for the first time, I was very surprised by a great number of commercial signs, mostly of the yellow color with black inscriptions, which flitted in towns as well as along the roads between towns. Even an important part of Belarusians who live in near-border towns, before Poland's accession to the European Union gained their living by carrying in cigarettes, vodka, diesel fuel for sale, and brining back inexpensive meat products and clothes. In today's conditions the Warsaw trade spirit remains; it probably became more civilized and orderly, but still distinct with kabobs, Addidas, cheap shoes and arrows in the direction of modern hypermarkets.

A visit to a shopping center is an indispensable item on the agenda of Belarusians who come to Warsaw. Objectively, today the choice of shoes and clothes in the Polish capital is more varied than in Minsk. Every Belarusian will always say with satisfaction than „here everything is cheaper than in Belarus". It is only because there is no well-designed system of rebates and sale promotions in Minsk. This is why Belarusians, running through Warsaw boutiques, are looking for the precious word of „Sale", where numerous things turn out indeed to be cheaper than in similar stores of the Belarusian capital. It also concerns the food products, but here the psychological effect of perception of everything cheap applies, because when it is ten zloty there, and ten thousand rubles in our country, all prices instantly become small and easily perceptible. In this way, the perception of importance of ten-zloty or twenty-zloty bill is lost.

Numerous Poles who visited Minsk remark on the contrary that prices in bars and restaurants of the capital are much lower than in those in Warsaw, and this is why comparing of price indicators is rather a useless and subjective matter.

About two million people live in Minsk and Warsaw which makes twenty per cent of the total population of Belarus and about five per cent in Poland. This is what I would like to point out because in Poland there is no big flow which would want to move namely to Warsaw. There are big cities which are as good as the capital city: Krakow, Poznan, and Gdansk. In Belarus differences between the capital city and regional cities are important. The best universities of the country, the highest salaries, the promising jobs, and the great diversity of leisure areas, all this is concentrated in Minsk.

Minsk has a lot of differences from Warsaw, just as Warsaw differs a lot from Berlin, Prague or Paris, but one should not forget, especially Belarusians, that these wonderful cities are united by one main circumstance – together they form the face of the united continent of „Europe".

Павел Белавус

# Вялікі футбол ля беларускай мяжы

Што такое футбол? Дзіўнае пытанне, і, як ні дзіўна, заўзятары і аматары гэтай гульні ў розных краінах адкажуць на яго зусім па-рознаму. Для беларусаў апошнім часам слова «футбол» збольшага ўжываецца разам са словам "БАТЭ" ды надзеямі, што нашая родная зборная вось-вось пераможа спачатку ўкраінцаў, пасля харватаў і трапіць хоць на які-небудзь чэмпіянат. Але пакуль гэта толькі мары…

У нашых бліжэйшых краінах-суседках футбол звязваюць зусім з іншымі надзеямі. На свае зборныя там наракаюць не менш, чым у нас, але футбол любяць па-сапраўднаму – з эмоцыямі, півам і адчуваннем свята з кожнай значнай для краіны гульнёй. Вось так, аб'яднаўшыся дзеля адной справы, Украіна і Польшча дамагліся, каб, размаўляючы пра футбол бліжэйшыя некалькі гадоў, гаварылі перш за ўсё пра Еўра-2012, які пройдзе менавіта ў гэтых краінах разам. Такім чынам зборныя Польшчы і Украіны атрымалі магчымасць без адбораў і кваліфікацый трапіць на еўрапейскі чэмпіянат.

Тым часам напрыканцы верасня дзякуючы Цэнтру міжнародных стасункаў, які знаходзіцца ў Варшаве, давялося завітаць у польскі цэнтр будучага футбольнага свята. Паралельна ў Польшчы і Украіне з ліпеня пачалі працаваць створаныя непасрэдна УЕФА два аб'яднанні, якія маюць назву «EURO 2012». Туды мяне, разам з групай беларускіх журналістаў, запрасіў прэс-сакратар польскага аб'яднання Юліюш Глускі.

Як распавёў спадар Глускі, галоўная мэта створаных арганізацый – правесці добры чэмпіянат. Адмыслова створаная польская урадавая арганізацыя «PL 2012» займаецца тым, каб былі добрыя дарогі, вакзалы, аэрапорты, гатэлі, а «EURO 2012» павінна зрабіць усё, каб былі матчы, каб быў сапраўды добры «футбольны спектакль».

У еўрапейскіх СМІ час ад часу з'яўляюцца розныя навіны, прысвечаныя будучаму чэмпіянату. Адно з галоўных пытанняў: ці паспее Украіна годна падрыхтавацца да спаборніцтваў і ці давядзецца абавязкі Украіны браць на сябе Германіі. Юліюш Глускі цвёрда запэўніў: «Немагчыма, каб чэмпіянат прайшоў у Польшчы і Германіі, ці толькі ў Польшчы, ці толькі ў Германіі. Без Украіны Еўра-2012 не будзе, бо гэта першапачаткова праект дзвюх нашых дзяржаў, нават украінцы першымі прапанавалі гэтую ідэю».

Распавёў прэс-сакратар і яшчэ некалькі цікавых фактаў. На Украіне большая праблема з інфраструктурай, чым са стадыёнамі. Там для сваіх клубаў добрыя футбольныя арэны ўжо пабудавалі ці будуюць мясцовыя алігархі, таму запланаванае ўзвядзенне стадыёнаў, па словах спадара Глу-

скага, Украіна выканае на 100 %. Ужо зараз рашэнне наконт правядзення матчаў у Кіеве прынятае канчаткова, а вось Харкаву, Данецку і Львову да канца кастрычніка УЕФА дало шанец даказаць, што яны гатовыя ўсё рабіць хутчэй.

У Польшчы на дадзены момант не вырашаныя пытанні больш з дарогамі, чым са стадыёнамі, бо добрыя трасы і іх будова знаходзяцца ў руках прыватнікаў, а стадыёны дапамагае будаваць дзяржава. У Варшаве стадыён плануецца здаць у першай палове 2011 года, яго будуюць на правым баку Віслы на месцы былога «Стадыёна Дзесяцігоддзя», дзе знаходзіўся раней знакаміты вялікі варшаўскі рынак. У Познані мадэрнізуюць гарадскі стадыён, а ва Ўроцлаве і Гданьску пабудуюць новыя.

Не меншае значэнне ў правядзенні Еўра-2012 мае і размяшчэнне так званай «сям'і УЕФА», якая складаецца з кіраўніцтва і службоўцаў федэрацыі, камандаў і іх персанала – усё гэта VIP-госці чэмпіянату, якіх паводле патрабаванняў УЕФА абавязкова трэба размясціць у пяцізоркавых гатэлях. Для каманд ёсць яшчэ некалькі ўмоў: месца трэніровак і гатэль павінны знаходзіцца на адлегласці 20 хвілін пераезду на аўтобусе, а ад аэрапорта і стадыёна да базы пражывання каманда павінна дабірацца не больш за гадзіну.

Польская і украінская арганізацыі «EURO 2012» – гэта часовыя аб'яднанні. Як прызнаўся Юліюш Глускі, у верасні 2012 года гэтая структура спыніць сваё існаванне, а ўсе супрацоўнікі, у тым ліку і ён, стануць беспрацоўнымі. Зараз у польскім офісе арганізацыі працуе каля 20 чалавек, але плануецца, што ў хуткім часе на працу прымуць яшчэ да 200 чалавек і тады ўжо пачнецца сапраўдная падрыхтоўка да чэмпіянату па футболе, які ўпершыню пройдзе ля самых межаў Беларусі.

Ці лёгка змогуць патрапіць на чэмпіянат беларусы? Пакуль гэтае пытанне яшчэ не вырашалася, шмат што залежыць і ад нашай зборнай.

А зараз беларусам засталося толькі чакаць 7 лютага, калі ў варшаўскім Палацы культуры і навукі адбудзецца лёсаванне групавога адборачнага турніру на чэмпіянат Еўра-2012.

Pavel Belavus

# Big-Time Soccer near the Belarusian Border

What is soccer? It is a strange question, and funny enough, funs and lovers of this game in different countries will have different answers to it. For Belarusians lately the word "soccer" is used mostly alongside with the word BATE and hopes that our national team is about to win the Ukrainians first and the Croats later and get into at least some championship, but these are still dreams.

In our neighboring countries soccer is associated with totally different dreams. They reproach their own national teams no less than we do, but they love soccer for real, with emotions, beer and feeling of feast with every game which is important for the country. This is how Ukraine and Poland which got united for the joint cause achieved that when people talk about soccer in the next several years, they talk in the first place about Euro-2012 which will be held namely in these two countries together. In such a way, the national teams of Poland and Ukraine got the possibility to get into the European championship without qualifications.

Meanwhile, in late September I had a chance to visit the Polish heart of the future soccer feast courtesy of the Center for International Relations based in Warsaw. Concurrently in Poland and Ukraine two associations called "EURO 2012" and established directly by UEFA started to work from July. I was invited there together with a group of Belarusian journalists by press secretary of the Polish association Juliusz Głuski.

As Mr. Głuski told us, the main objective of these associations is to hold a good championship. The expressely established Polish government organization "PL 2012" concerns itself with ensuring good roads, stations, airports, and hotels, and "EURO 2012" must do everything in order to ensure games and a truly good "soccer show".

European mass media publish from time to time different news stories about the future championship. One of the main issues: will Ukraine succeed in getting ready for competitions on time and properly, or will Germany have to undertake Ukraine's responsibilities? Juliusz Głuski reassured firmly: "It is impossible that the championship takes place in Poland and Germany, or only in Poland, or only in Germany. There will not be a Euro-2012 without Ukraine, because initially it was the project of our two countries, and even the Ukrainians were the first to come up with this idea".

The press secretary gave us some interesting facts. In Ukraine problems are greater with infrastructure, and not stadiums. Local oligarchs have already built or are building good soccer arenas for their clubs, so, according to Mr. Głuski, Ukraine will implement for one hundred per cent its plans for construction of

stadiums. The final decision about holding games in Kyiv was taken already, and Kharkiv, Donetsk, and Lviv were given time by UEFA till the end of October to prove that they are ready to do everything faster.

In Poland for the time being the issue of good roads has been resolved less that the issue of stadiums, because good roads and their construction are in private hands, and stadiums are being built with assistance from the State. In Warsaw plans are to put the stadium in commission in the first part of 2011; it is being built on the right bank of Vistula on the site of the former Stadium of the Tenth Anniversary, where the renowned big Warsaw market was also situated earlier. In Poznan the city stadium is being modernized, and in Wroclaw and Gdansk new stadiums will be built.

No less importance for holding EURO has also the accommodation of the so-called "UEFA family" which is made of top managers and officials of the Federation, teams and their personnel – all of them are VIP-guests of the championship and according to UEFA's demand they must be accommodated in five-star hotels. There are also several conditions for teams: the training site and the hotel must be within twenty-minute traveling distance by bus, and the team should get from the place of accommodation to the airport and the stadium in less than one hour.

The Polish and Ukrainian associations "EURO 2012" are temporary associations. As Juliusz Głuski admitted, in September 2012 this structure will cease its existence and all its employees including him will become unemployed. But now about twenty people work in the Polish office of the association, and it is envisaged that soon the skyscraper's floor that they occupy all by themselves will employ up to two hundred people and then they will begin true preparations for the soccer championship which for the first time will take place near the very borders of Belarus.

Will it be easy for Belarusians to get to the championship? This issue has not yet been resolved; much depends on our national team.

And now Belarusians have only to wait till February 7 when in the Warsaw Place of Culture and Science the drawing procedure of the group qualifications to Euro-2012 will be held.

Юры Дракахруст

# Беларусь-Польшча: ці перакрыжоўваюцца паралельныя?

Хаця Польшча і Беларусь атрымалі незалежнасьць (Беларусь нават і фармальную) і пазбавіліся камунізму гістарычна амаль адначасна, паміж працэсамі ў дзьвюх краінах ляжала бездань. Гэтая бездань вызначыла і далейшыя траекторыі разьвіцьця Беларусі і Польшчы.

У польскую антыкамуністычную рэвалюцыю 1980–1989 гг. была ў той ці іншай ступені заангажаваная значная колькасьць насельніцтва, у «Салідарнасьці» ў яе лепшыя часы ўдзельнічала добрая чвэрць дарослага насельніцтва Польшчы. Польскі працэс быў вынікам самаразьвіцьця польскага грамадзтва, у пэўным сэнсе Польшча была ўзорам і рухавіком распаду ўсясьветнай камуністычнай сыстэмы.

У адрозьненьне ад Польшчы рэвалюцыйныя працэсы ў Беларусі былі ў большай ступені наведзенымі, індукаванымі тымі працэсамі, тым крызысам, што адбываўся ў СССР – краіне, часткай якой Беларусь была.

Безумоўна, беларуская апазыцыя, найперш Беларускі Народны Фронт, адыгралі значную ролю ў атрыманьні незалежнасьці і падзеньні камуністычнай сыстэмы ў Беларусі, але падаецца, што гэтая роля тычылася больш формаў працэсаў, а ня іх сутнасьці. Калі б камунізм не абрынуўся ва ўсім Савецкім Саюзе, і ў першую чаргу ў Расеі, калі б ня моцны рух да незалежнасьці ў балтыйскіх і каўкаскіх рэспубліках СССР і ва Ўкраіне, наўрад ці Беларусь уласнымі сіламі атрымала б незалежнасьць і пазбавілася панаваньня камуністычнай партыі.

На карысьць такога погляду можна прывесьці некалькі аргумэнтаў. Незалежнасьць і крах камунізму адбыліся ў рэшце рэшт ва ўсім СССР – ад Эстоніі да Туркмэніі, дзе ніякай апазыцыі не было наагул. У беларускую рэвалюцыю 1989–1991 гг. (калі яе можна так назваць) было заангажавана значна менш людзей, чым у адпаведных падзеях у Польшчы, балтыйскіх краінах і ва Ўкраіне. Нарэшце, ступень удзелу нацыі ва ўласным вызваленьні абумоўлівае і далейшую ходу падзеяў. А прыход да ўлады ў 1994 годзе Аляксандра Лукашэнкі, небясьпечныя інтэграцыйныя гульні з Расеяй (якія, дарэчы, пачаліся яшчэ да яго прыходу), паўставаньне квазісавецкай, аўтарытарнай сыстэмы пацьвяржаюць тэзу, што незалежнасьць і крах камунізму зваліліся на беларусаў, як сьнег на галаву.

Варта адзначыць, што польская антыкамуністычная рэвалюцыя мела асаблівасьці, якія не былі паўтораныя ні ў адной іншай краіне Цэнтральнай Эўропы і былога СССР, – гэта значная доля рабочых у антыкамуністычным

руху. Гэта, дарэчы, выклікала ў Беларусі дадатковыя сымпатыі да польскай рэвалюцыі па-за межамі кола інтэлігенцыі. Рабочыя хваляваньні ў Менску і іншых беларускіх гарадах у красавіку 1991 году абазначылі магчымасьць падобнага на польскі шляху рэвалюцыі, але гэтыя падзеі, хаця і аказалі пэўны ўплыў на рэвалюцыйны працэс у СССР у цэлым, у Беларусі сталіся толькі асобным эпізодам, які ня меў палітычнага працягу.

Нягледзячы на правал у аўтарытарную «яміну» (правал, магчыма, і непазьбежны), варта адзначыць і станоўчыя зьявы, якія адбыліся ў Беларусі за гады незалежнасьці і ў гады кіраваньня Лукашэнкі. Гэта найперш станаўленьне інстытутаў незалежнай дзяржавы. Можна спрачацца наконт іх эфэктыўнасьці, але варта прыгадаць сытуацыю 1991 году, калі існавалі сурьёзныя сумневы ў тым, ці здольныя беларусы стварыць іх наагул. Праўда, і дагэтуль беларуская эканоміка застаецца вельмі залежнай ад расейскай, але тое, што амаль палова беларускага экспарту пераарыентавалася на Захад, сьведчыць, што і ў гэтай галіне фармаваньне інстытутаў незалежнай дзяржавы адбылося ці пакрысе адбываецца.

Куды больш складаным шляхам адбываецца фармаваньне нацыянальнай і дзяржаўнай ідэнтычнасьці. У Беларусі клясычная культурна-этнічная мадэль нацыі застаецца здабыткам параўнальна нешматлікага кола. Нацыянальная ідэнтычнасьць пераважнай большасьці фармуецца праз досьвед квазідзяржаўнасьці Беларускай ССР, парадаксальным чынам нават праз дыстанцыяваньне ад капіталістычнай і алігархічнай Расеі, у адрозьненьне ад якой Беларусь захавала вернасьць свайму з Расеяй агульнаму сацыялістычнаму мінуламу.

Гэты падмурак выглядае досыць хісткім, асабліва на польскі погляд, дзе нацыянальная ідэнтычнасьць сфармаваная зусім іншым шляхам. Аднак пакуль гэты падмурак аказваецца дастаткова трывалым, каб беларускае грамадзтва супрацьстаяла тым выклікам, якія кідаюць яму няпростыя стасункі з Расеяй.

На мой погляд, варта зьвярнуць увагу таксама на цікавае падабенства Беларусі і Польшчы. Толькі гэтыя дзьве краіны мелі ў посткамуністычны пэрыяд «хлопскіх цароў» – Леха Валенсу і Аляксандра Лукашэнку, лідэраў, якія не былі выхадцамі ні з інтэлігенцыі, ні з камуністычнай намэнклятуры, прадстаўнікоў ніжэйшых слаёў грамадзтва.

Польшча як адна з самых вялікіх краінаў рэгіёну, краіна з моцнай і прывабнай культурай, дастаткова эканамічна разьвітая, зьнітаваная з суседзямі шчыльнымі гістарычнымі сувязямі, натуральным чынам імкнецца да лідэрства ў рэгіёне, да ролі адваката і апекуна сваіх постсавецкіх суседзяў. Да таго ж беларусы станоўча ацэньваюць эканамічныя дасягненьні Польшчы, у тым ліку і ў параўнаньні з Беларусьсю, пра што сьведчаць, напрыклад, да-

дзеныя апытаньняў Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў.

**Табліца 1. Дынаміка адказаў на пытаньне «Як, на Ваш погляд, жывуць людзі ў суседніх краінах?», %**

| Варыянт адказу | Лепш, чым у Беларусі | | | | Гэтак жа, як у Беларусі | | | | Горш, чым у Беларусі | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 03'05 | 04'06 | 08'06 | 06'09 | 03'05 | 04'06 | 08'06 | 06'09 | 03'05 | 04'06 | 08'06 | 06'09 |
| У Польшчы | 63.1 | 50.8 | 46.2 | 59.7 | 15.2 | 26.0 | 22.5 | 21.1 | 2.9 | 11.4 | 14.9 | 6.3 |
| У Латвіі | 47.6 | 39.7 | 34.1 | 38.7 | 19.1 | 26.3 | 23.3 | 25.5 | 6.4 | 18.0 | 21.9 | 16.8 |
| У Летуве | 45.7 | 36.8 | 33.1 | 39.5 | 20.8 | 27.3 | 25.0 | 26.6 | 6.2 | 20.0 | 21.9 | 14.7 |
| У Расеі | 28.9 | 24.6 | 21.2 | 39.6 | 40.4 | 40.7 | 44.6 | 38.2 | 15.9 | 28.1 | 23.6 | 15.0 |
| Ва Ўкраіне | 11.2 | 10.9 | 8.4 | 16.5 | 30.9 | 26.0 | 29.3 | 25.8 | 41.6 | 56.1 | 50.6 | 50.4 |

Як бачым, Польшча зьяўляецца лідэрам параўнальных staноўчых ацэнак. Да таго ж варта дадаць, што палякі – народ, вельмі блізкі беларусам этнічна і культурна, яны саступаюць адно расейцам і знаходзяцца прыкладна на адным узроўні з украінцамі (гл. http://www.iiseps.org/4–06–5.html).

Але так выглядае, што магчымасьці польскага ўплыву на Беларусь маюць натуральныя абмежаваньні, якія, магчыма, не заўсёды ў Польшчы ўсьведамляюцца. Адна з прычынаў палягае ў тым, што, нягледзячы на блізкасьць, беларусы і палякі – тыпалягічна вельмі адрозныя нацыі. Паводле беларускага дасьледчыка Юрыя Шаўцова, беларускае нацыянальнае не маніфэстуецца, а праяўляецца. Польскае ж нацыянальнае выразна акрэсьленае і часам нават дэманстратыўна заманіфэставанае.

Два народы адрозьніваюцца таксама ў стаўленьні да Расеі. Кажучы зусім проста, для палякаў Расея, расейцы – цывілізацыйна чужыя, для беларусаў – свае. Апошняе не выключае канфліктаў, але іх характар – не межцывілізацыйны. Гэта абумоўлівае і іншую, адрозную ад польскай, нацыянальную геапалітычную карціну сьвету. Нават для праэўрапейскі арыентаванай часткі беларускага насельніцтва Польшча – ня ўзор і не настаўнік у эўрапейскасьці.

**Табліца 2. Разьмеркаваньне адказаў на пытаньне «Калі б Беларусь стала сябрам ЭЗ, на якія групы краінаў ёй варта было б арыентавацца?», % (травень 2006 г.)**

| Варыянт адказу | % |
|---|---|
| На «старых» кантынэнтальных сябраў ЭЗ – Нямеччыну, Францыю, Гішпанію і інш. | 41.4 |
| На новых сябраў ЭЗ – Польшчу, Летуву, Чэхію, Вугоршчыну, Славакію і інш. | 12.9 |
| На Вялікую Брытанію | 5.1 |

Дзіўным чынам беларусам больш утульна з культурна далёкімі немцамі, чым з культурна блізкімі палякамі. Можна выказаць небеспадстаўную гіпотэзу, што нават у пэрспэктыве, пры зьмене палітычнай сытуацыі ў Беларусі і выразным эўрапейскім выбары, Беларусь стане не яшчэ адной краінай «новай» Эўропы, а фарпостам на ўсходзе кантынэнту «старой» Эўропы.

Усе сказанае тычыцца настрояў і інтэнцыяў беларускага грамадзтва ў цэлым, гэтаму зусім не супярэчыць наяўнасьць у беларускім грамадзтве

групаў, выразна арыентаваных на Польшчу, якія натхняюцца менавіта польскім досьведам. Але гэтыя групы занадта малыя, яны маюць досыць абмежаваныя магчымасьці пашырэньня свайго ўплыву, і ня толькі з прычыны рэпрэсіўнага характару беларускай дзяржавы, але і з адрознасьці іх культурнага коду ад коду большасьці.

Выглядае, што Польшча магла б пашырыць свой уплыў у Беларусі не як яе эўрапейскі адвакат, а як бацькаўшчына «Салідарнасьці» зь яе ідэалам роўнасьці і справядлівасьці.

Yury Drakakhrust

# Belarus-Poland: Will the Parallels Intersect?

Althouth Poland and Belarus obtained independence and got rid of Communism historically almost at the same time, an entire abyss could be seen between the processes, taking place in the countries. It was this abyss that determined further paths of development of Belarus and Poland.

A large part of Polish citizens was engaged in the Polish Anti-Communist revolution of 1980 – 1989 this way or another. Nearly 25% of adult population of Poland participated in the "Solidarity" TU activities in its better times. The Polish process resulted from self-development of Polish society. Actually, Poland was a good example and a generator of the global Communist system collapse.

Першым экспертам, з якім давялося сустрэцца ў Варшаве, быў сп. Яраслаў Каліноўскі, дэлегат па справах Беларусі ў Еўрапарламенце. Сп. Каліноўскі адзначыў, што сёння, нягледзячы на разыходжанне ў поглядах на дэмакратычныя стандарты ў Беларусі і Польшчы, нашыя краіны павінны супрацоўнічаць. І Польшча павінна не ізалявацца ад Беларусі, а паступова, маленькімі крокамі набліжаць усходнюю суседку да сябе, напрыклад, праз гандлёва-эканамічныя адносіны. Гэта як бот, прасунуты ў дзверы, якія трэба адчыніць: хоць і не адчынім пакуль, але ж і зачыніцца ім не дамо.

Безумоўна, Польшча хоча таксама дапамагчы беларускай грамадскасці, якая жадае дэмакратычных зменаў; хоча развіваць цывільнае грамадства, бо, каб змяніць сітуацыю ў Беларусі, павінна змяніцца само грамадства. Важнымі аспектамі, якія могуць паўплываць на грамадскую думку, Захад лічыць спрашчэнне візавага рэжыму і культурнае супрацоўніцтва. Разам з тым Польшча і іншыя краіны ЕС разумеюць, што беларусы павінны самі вырашаць свой лёс.

А вось журналіст тыднёвіка «Newsweek» Міхал Кацэвіч спадзяецца, што новае пакаленне беларускай эліты будзе арыентавацца на Еўропу і ў будучыні зможа па-новаму кіраваць краем. А Польшча, якая раней была мурам паміж Беларуссю і Еўропай, сёння хоча стаць мостам паміж імі. Але гэта не будзе лёгка: Польшча пакуль не мае вялікага ўплыву ў Еўрасаюзе, у якога, у сваю чаргу, няма адзінай палітыкі ў дачыненні да Беларусі. А таму працэс уцягвання Беларусі ў сферу ўплыву ЕС будзе, хутчэй за ўсё, вельмі марудным і паступовым, бо аб’яднаная Еўропа – гэта вялікая і неаднародная структура.

Да таго ж у польскіх дыпламатаў пакуль няма выпрацаванага плана дзеянняў у дачыненні да Беларусі – цяжка ж адразу братацца з афіцыйным

Мінскам! Безумоўна, любыя крокі беларускіх уладаў насустрач будуць вітацца: так, палякаў вельмі хвалюе праблема непрызнання афіцыйнымі ўладамі Саюза палякаў на чале з Анжалікай Борыс. Што да спрашчэння візавага рэжыму, то тут важным аспектам з'яўляецца фактычная адсутнасць мяжы паміж Беларуссю і Расіяй.

Таксама сп. Кацэвіч выказаў цікавае меркаванне, што калі будзе наладжана толькі гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва паміж Захадам і Беларуссю пры адсутнасці дэмакратычных трансфармацый у беларускім грамадстве, то гэта можа прывесці да эры новай ізаляцыі і ментальнай адчужанасці: *маючы кантакт у сферы эканомікі і гандлю, еўрапейцы адкінуць думку, што Беларусь належыць ці можа належаць да Еўропы.*

Журналіст адзначыў, што *Еўропа расчаравалася ў магчымасцях беларускай апазіцыі* і цяпер, пасля больш як дзесяці год безвыніковай палітыкі ігнаравання афіцыйных уладаў краіны, перад еўрапейцамі паўстала пытанне: «Калі мы змарнавалі столькі гадоў, робячы стаўку на палітыку ізаляцыі, што тады рабіць з Беларуссю? Што рабіць, калі мы ўвесь час падтрымліваем апазіцыю, але гэта нічога не дае?»

Эксперт Еўракамісіі ў справах усходняй палітыкі, сп. Эўгеніюш Смоляр таксама адзначыў, што сёння ЕС проста не можа не прызнаваць і ігнараваць афіцыйны Мінск, паколькі ён рэальна кіруе ў Беларусі. Безумоўна, будзе працягвацца і супраца з беларускімі няўрадавымі арганізацыямі, накіраваная на тое, каб паспрыяць дэмакратычным трансфармацыям беларускага грамадства.

*Калі прынцыповая палітыка ізаляцыі зазнала паразу, то цяпер яе месца займае прагматычная палітыка, накіраваная на тое, каб захаваць стабільнасць у гэтым рэгіёне і атрымаць пэўныя дывідэнды ад эканамічнага супрацоўніцтва.* Рэаліі ж глабальнага рынку такія, што Беларусь не можа існаваць як ізаляваная выспа і яе ўрад будзе вымушаны або ахвяраваць незалежнасцю, або з рызыкай для ўлады распачаць працэс дэмакратызацыі. Калі ж урад Беларусі пойдзе на супрацу з ЕС, то ў беларускім грамадстве з цягам часу з'явяцца групы людзей, якія будуць звязваць сваю будучыню менавіта з Еўропай.

У сувязі з гэтым сп. Смоляр падкрэсліў, што новая палітыка ЕС у дачыненні да Беларусі – гэта паступовая адмена санкцый у абмен на саступкі беларускай улады, але не шлях рэвалюцыі.

Нарэшце, аглядальнік з уплывовага польскага тыднёвіка «Polityka» Марэк Астроўскі выказаў меркаванне, што Польшча, імкнучыся развівацца па заходнім узоры і ўладкаваўшы свае адносіны з моцным суседам на захадзе (Нямеччынай), мусіць звярнуцца і на ўсход. Вядома ж, у ідэале палякі хацелі б і там бачыць моцнага суседа, які, як лакаматыў, штурхаў бы Польшчу

да пазітыўных зменаў. Тым не менш, якой бы ні была сённяшняя Беларусь з пункту гледжання палякаў, ім, паводле сп. Астроўскага, нічога не застаецца, як добрасуседства і трансгранічная супраца з гэтай краінай.

Пра іншыя меркаванні наконт палітыкі «Усходняга партнёрства» і тое, якую карысць прынесла Польшчы ўступленне ў ЕС, чытайце ў другой частцы матэрыялу.

**Частка 2**

*Польшча стала адным з ініцыятараў праграмы «Усходняе партнёрства», якая прадугледжвае ўцягванне Беларусі, гэтаксама як Азербайджана, Арменіі, Грузіі, Малдовы і Украіны, у агульнаеўрапейскі кантэкст развіцця найперш праз гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва. Якім бачаць гэты працэс польскія аналітыкі, грамадскія дзеячы і журналісты? Што даў ЕС Польшчы і што ён можа даць Беларусі?*

*Нядаўна група беларускіх журналістаў наведала Польшчу з візітам, падчас якога на згаданыя пытанні адказалі польскія палітыкі, журналісты і аналітыкі.*

Сп. Ігнацы Немчыцкі, спецыяліст аналітычна-стратэгічнага дэпартамента Камітэта еўрапейскай інтэграцыі, прычынай звароту ўвагі Польшчы на ўсходнія межы назваў тое, што менавіта па іх цяпер праходзіць мяжа ЕС. Аб'яднаная Еўропа, у сваю чаргу, мусіць пашыраць уплыў ва ўсходнім напрамку (шляхам палітыкі добрасуседства), каб нейтралізаваць уплыў Расіі. Безумоўна, і слабасць беларускай апазіцыі прымусіла Еўропу шукаць шляхі супрацы з афіцыйным Мінскам. І на пачатковым этапе гэтай супрацы галоўным яе вектарам бачыцца менавіта гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, якое ў доўгатэрміновай перспектыве павінна прывесці да дэмакратызацыі краіны. Разам з тым беларускае грамадства павінна быць актыўным, бо Еўропа можа толькі прапанаваць пэўныя магчымасці Беларусі.

Падобнае меркаванне выказаў і кіраўнік Фундацыі былога прэзыдэнта Польшчы Аляксандра Квасьнеўскага Ірэнюш Біль.

Захад прыйшоў да высновы, што калі ў Беларусі немагчыма выклікаць рэвалюцыйныя змены шляхам супрацы з апазіцыяй, то трэба ісці эвалюцыйным шляхам: маладое пакаленне беларускай улады больш арыентаванае на Еўропу, а значыць, у перспектыве яно можа змяніць вектар геапалітыкі краіны.

«Мы перакананыя, што дэмакратыю нельга навязаць зверху, яна сама павінна саспець у грамадстве», – падкрэсліў сп. Біль. Цяпер Захад хоча выкарыстоўваць новыя інструменты ў дачыненнях з Беларуссю і такім чынам даць ёй новыя магчымасці для дэмакратычных пераменаў. Асноўная

задача ЕС – выцягнуць Беларусь з поля ўплыву Расіі. Тым не менш, пакуль самі палякі не ўпэўнены ў эфектыўнасці новай палітыкі ў дачыненні да Беларусі, таму што Еўрапейскі Саюз – гэта даволі вялікая і неаднародная структура, многія краіны якой аддаюць перавагу іншым праектам.

Пра эвалюцыйны шлях супрацы паміж ЕС і Беларуссю казаў і прадстаўнік польскага МЗС, паводле якога прыярытэт Еўропы – садзейнічаць незалежнасці Беларусі і стабільнасці ў гэтым рэгіёне, а ўжо потым ідуць дэмакратычныя змены.

Еўрапейцы за апошняе дзесяцігоддзе паспелі пераканацца, што палітыка ізаляцыі – найгоршы варыянт нароўні з інкарпарацыяй Беларусі ў Расію. Пры гэтым не трэба думаць, што «Усходняе партнёрства» накіравана супраць Расіі, таму што будучыня гэтай краіны таксама звязана з Еўропай.

А той факт, што на развіццё ўзаемаадносінаў з Беларуссю ў межах «Усходняга партнёрства» ЕС выдаткаваў параўнальна невялікія грошы, азначае, што Еўропа зацікаўленая гэтым праектам і гатова пашыраць супрацу пры ўмове тэндэнцый да дэмакратычных трансфармацый у Беларусі. Пры гэтым ніхто на Захадзе ўжо не мае ілюзій наконт магчымасці адносна хуткай дэмакратычнай трансфармацыі ў Беларусі.

«Навошта палякі цалуюць жанчыне руку? Бо трэба ж з чагосьці пачынаць»,– гэты анекдот палітык распавёў, каб паказаць, што «Усходняе партнёрства» – гэта таксама пачатак новага этапу ў агульнаеўрапейскай палітыцы.

А вось дэпутат польскага Сейма і сябар камісіі па Беларусі распавёў, што ў Сейме РП ёсць так званая «група сябраў Беларусі» (каля 30 дэпутатаў), якая шмат працуе ў справе Беларусі і хацела б бачыць гэтую краіну ў зусім іншай эканамічнай, культурнай і палітычнай сітуацыі. Разам з тым дэпутат прызнаў, што працаваць у гэтым напрамку трэба многа і цяжка: «У справе з Беларуссю няма простых рашэнняў. Ключавы партнёр Еўропы ў справах з гэтай краінай – перадусім моладзь і інтэлігенцыя, пакаленне, якое можа змяніць Беларусь».

*Шмат увагі ў нашых размовах надавалася і таму, што дало Польшчы сяброўства ў Еўрасаюзе і што можа даць Беларусі супраца з аб'яднанай Еўропай.*

Так, сп. Яраслаў Каліноўскі, дэлегат па справах Беларусі ў Еўрапарламенце, адзначыў, што вялікія сумневы і боязь таго, што ўступленне ў ЕС прывядзе да эканамічнай катастрофы, не спраўдзіліся. Атрымалася наадварот – Польшча атрымала моцную падтрымку ў галінах сельскай гаспадаркі, аховы навакольнага асяроддзя і захавання культурных традыцый. Пры гэтым вялікім плюсам з'яўляецца тое, што Еўропа падтрымлівае менавіта еўрапейскую мадэль развіцця краіны, вылучаючы вялікія датацыі на адпаведныя змены ў Польшчы.

Напрыклад, сп. Юліюш Глускі, прэс-сакратар аб’яднання «EURO 2012», якое рыхтуе еўрапейскі чэмпіянат па футболе, распавёў, што Польшча, рыхтуючыся разам з Украінай прыняць Еўра-2012, атрымала вельмі моцны імпульс для развіцця адпаведнай інфраструктуры: будаўніцтва новых стадыёнаў, трэніровачных баз, гатэляў, дарог, рэканструкцыя аэрапортаў і г. д. «Мы проста павінны хутка развівацца, і Еўра-2012 – гэта як пуга над намі, бо мы павінны не аганьбіцца перад усім светам», – падкрэсліў ён.

Прадстаўнік Польскай палаты па турызме сп. Дарыюш Войтал паказаў змены ў эканоміцы Польшчы на прыкладзе галіны турызму. Цікава, што пасля ўступлення Польшчы ў ЕС найбольшы імпульс для развіцця атрымаў менавіта турызм, паколькі межы сталі адкрытымі і Польшча выйшла на рынак заходніх тураператараў. Так, калі ў 2004 г., напрыклад, Егіпет наведалі толькі 150 тыс. палякаў, то ў 2008 г. – 600 тыс. Безумоўна, развіццю турызму паспрыялі і вялікія інвестыцыі з ЕС. І сёння турызм прыносіць 1/3 даходаў у польскі бюджэт – нават больш, чым энергетыка. Натуральна, развіваецца інфраструктура, якая цяпер павінна адпавядаць самым высокім патрабаванням. І ўвогуле, сёння палякі надаюць вялікую ўвагу таму, як прадаваць, як зрабіць Польшчу прывабнай для турыстаў.

А вось сп. Ігнацы Немчыцкі назваў цэлы шэраг пазітыўных зменаў у Польшчы пасля ўступлення ў ЕС:

- рост ВУП, паколькі Польшча атрымлівае вялікія інвестыцыі з ЕС;
- зніжэнне беспрацоўя (2003 г. – 20 %, 2008 г. – 10 %) за кошт стварэння новых месцаў працы і міграцыі рабочай сілы ў краіны ЕС;
- развіццё турызму (адкрытыя межы);
- развіццё сістэмы аховы навакольнага асяроддзя, якая павінна адпавядаць еўрапейскім стандартам;
- уніфікацыя нарматыўнага заканадаўства;
- ментальныя змены – сёння палякі ў значна большай ступені адчуваюць сябе еўрапейцамі, чым гэта было да ўступлення ў Еўрасаюз.

Вельмі станоўча пра ўступленне Польшчы ў ЕС выказаўся і дарадца Прэзідэнта РП у справах міжнароднага супрацоўніцтва Марыюш Хандзлік, які таксама грунтоўна акрэсліў і еўрапейскую перспектыву Беларусі.

Сп. Хандзлік сказаў, што змены, якія адбыліся ў Польшчы цягам апошніх 20 гадоў і асабліва пасля далучэння яе да ЕС, пераўзышлі ўсе чаканні і сведчаць, што рашэнні, прынятыя ў 1989 г., былі правільнымі. Найлепшым жа палякам бачыцца тое, што яны маюць свабоду і магчымасць выбіраць і трымаюць свой лёс ва ўласных руках.

«Еўрасаюз – гэта найлепшы эксперымент у гісторыі свету, унікальнае дзяржаўнае ўтварэнне, якое прыносіць вялікую карысць як для сваіх грамадзян, так і для дзяржаў-сябраў ЕС. Але Еўропа ніколі не будзе воль-

най, пакуль не будзе салідарнай, пакуль там не будуць краіны, якія сёння ўваходзяць у праграму «Усходняе партнёрства». Мы не можам быць цалкам шчаслівымі, пакуль нашы ўсходнія суседзі знаходзяцца ў горшых умовах», – паведаміў польскі дыпламат.

Увогуле ж «Усходняе партнёрства», паводле сп. Хандзліка, павінна збліжаць вышэйзгаданыя краіны з ЕС, быць мостам паміж аб'яднанай Еўропай і гэтымі дзяржавамі.

«Усходняе партнёрства» – гэта вялікі шанец на збліжэнне з Еўропай. Разам з тым мы разумеем, што гэта не хуткабежны працэс, бо нават Польшча 15 гадоў ішла да таго, каб уступіць у ЕС. Сёння мы хочам супрацы, і вы можаце разлічваць на нашу салідарнасць і дапамогу. Тым не менш, усё залежыць ад волі беларускага грамадства», – кажа сп. Хандзлік.

Ад Беларусі ж Еўропа чакае крокаў насустрач: гэта лібералізацыя выбарчага заканадаўства, спыненне абмежавання свабоды СМІ і недзяржаўных арганізацый, лібералізацыя рынку і эканамічныя рэформы. Каб пачаць збліжэнне з ЕС, Беларусь павінна найперш уступіць у Сусветную гандлёвую арганізацыю. Таксама вельмі важным аспектам з'яўляецца непрызнанне Беларуссю незалежнасці Абхазіі і Паўночнай Асеціі. Для Польшчы ж вельмі істотным з'яўляецца тое, што беларускія ўлады павінны спыніць пераслед Саюза палякаў на чале з Анжалікай Борыс.

Напрыканцы дарадца Леха Качыньскага выказаў думку, што такая магутная структура, як ЕС, мусіць пашырацца, а значыць, будуць працягвацца і палітычныя кансультацыі з РБ: «Карыстаючыся прынцыпамі салідарнасці і дэмакратыі, мы хочам дзяліцца з нашымі суседзямі ўсім найлепшым, што ёсць у Польшчы. «Усходняе партнёрства» – гэта найперш інструмент, з дапамогай якога мы размаўляем з азначанымі краінамі. Інтэграцыя Беларусі ў ЕС і НАТО непазбежная, бо няма будучай Еўропы без такіх дзяржаў, як Беларусь, як адной з тых, што ўтварыліся пасля распаду СССР».

*Падвядзем вынік усяму вышэйсказанаму.*

Асноўныя мэты праграмы «Усходняе партнёрства»:

- ангажаваць грамадскія супольнасці краінаў «Усходняга партнёрства» ў сферу ЕС (уключаючы пазаўрадавыя арганізацыі, прадстаўнікоў бізнесу і мясцовых уладаў) з мэтай максімальнага набліжэння гэтых краін да Еўрасаюза;
- інтэграцыя ў розных аспектах дзейнасці (найперш стварэнне агульнай эканамічнай прасторы);
- палягчэнне візавага рэжыму;
- супраца ў галіне энергетычнай бяспекі і развіцця энергетычнай інфраструктуры.

Што можа даць Беларусі «Усходняе партнёрства» і далейшая супраца з ЕС:

- спрошчанае наведванне беларускімі грамадзянамі краін-сябраў ЕС;
- пашыранае трансгранічнае супрацоўніцтва, якое спрыяе большаму ўзаемадзеянню ў эканамічным жыцці, ахове навакольнага асяроддзя;
- падтрымка беларускай эканомікі, дапамога ў развіцці прадпрымальніцтва і падрыхтоўка беларускіх прадпрыемстваў да выхаду на еўрапейскі рынак;
- падтрымка праграмаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця Беларусі праз еўрапейскую фінансавую дапамогу;
- паляпшэнне сістэмы аховы здароўя і адукацыі;
- больш эфектыўнае дзяржаўнае і мясцовае кіраванне;
- рэформа прававой і судовай сістэмы з мэтай забеспячэння роўных правоў для ўсіх грамадзян;
- лепшыя эканамічныя магчымасці для Беларусі і палепшаныя ўмовы жыцця для яе грамадзян праз развіццё і мадэрнізацыю транспартнай і энергетычнай сістэмы;
- паляпшэнне стану навакольнага асяроддзя (якасць вады, утылізацыя выкідаў і падтрымка ў барацьбе з наступствамі Чарнобыльскай катастрофы);
- больш блізкі дыялог і шчыльнае супрацоўніцтва з Еўропай ва ўсіх іншых сферах.

Такім чынам, дзверы ў Еўрапейскі Саюз не зачыненыя, і толькі ад нас залежыць, ці захочам мы ўвайсці ў дом аб’яднанай Еўропы. Ад гэтага выйграюць усе.

Yuras Kalasouski

# At the Crossroads Again or Why Does Poland Call Belarus into Europe?

**Part I**

*Situated between the East and the West, the North and the South, for centuries long Belarus was at the junction of cultures and creeds, in unique conditions of multinational contacts at the crossroads of the Eastern and Western civilizations. And today's realities confirm it: after more than ten years of the isolation policy Europe invites Belarus to work together, seeking to pull it out of Russia's sphere of influence.*

Recently the Warsaw Center for International Relations organized a week-long information and educational visit for the Belarusian journalists who won the competition dedicated to comparing changes which occurred in Poland and Belarus during the last twenty years. Over the week several meetings were held with Polish experts, politicians and journalists, and one of their main topics was a discussion on prospects of the new policy of the unified Europe towards Belarus. The meetings were all the more interested because Poland is one of the authors of the Eastern Partnership program through which the European Union plans to improve relations with Belarus. And it is the Eastern partnership which is the priority area for Poland in today's policy of the unified Europe.

I will remind that this program developed by the European Union at the initiative of Poland and Sweden and approved in May 2009 in Prague declares that the civil society is a key factor for success of democratic and market-oriented reforms and provides for closer cooperation between the European Union and six Eastern European countries – Azerbaijan, Armenia, Belarus, Georgia, Moldova, and Ukraine – in the economic and political spheres.

To Belarus, its participation in the Eastern Partnership means liberalization of the electoral legislation and trade relations with the European Union, simplification of the visa regime, and participation in programs on energy security, administrative reforms, and environmental protection. Thus, the Eastern Partnership opens to our country the door to Europe which remained closed for a long time.

Already some analysts call the Eastern Partnership a turning point, a historic event and even a beginning of Belarus' comeback to the mainstream of the European civilization which it historically belongs to. That said, it is beyond dispute that the Eastern Partnership is an outset of a new policy whose forms and methods are still being defined. This brings up the question: what does Europe expect from Belarus and how does it envisage building relations with our country further on?

After numerous conversations with Polish analysts, community leaders and journalists I tried to create a general picture which would describe rather integrally the new turning point in the EU policy known as the Eastern Partnership.

But I will reiterate before everything else that this project is only a start of a new and probably long-term stage of the European policy which is still to be filled with concrete substance. The European Union which intends to work with Belarus in the long term has not decided yet on the forms and methods of its new policy. Also, one should not forget that the European Union has twenty-seven centers of decision-making many of which are not very interested in developing relations with Belarus giving priority to other projects.

The first expert who we met in Warsaw was Mr. Jarosław Kalinowski, delegate on Belarus' matters in the European Parliament. Mr. Kalinowski pointed out that today, despite differences of views on democratic standards in Belarus and Poland, our countries must cooperate. And Poland should not isolate itself from Belarus but should bring its eastern neighbor closer to itself gradually and through small steps, for example, through trade and economic relations. It resembles a boot put in the door that we must open: we will not be able to open it yet, but we will not let it be closed.

Certainly, Poland also wants to help the Belarusian civil society which desires democratic changes; it wants to develop the civil society because in order to change the situation in Belarus the society itself has to change. The West sees the simplification of the visa regime and the cultural cooperation as important aspects which can influence the public opinion. At the same time, Poland and other EU countries understand that the Belarusians have to decide their own destiny.

And Michał Kacewicz, journalist of Newsweek weekly, hopes that the new generation of the Belarusian elite will orient itself to Europe and will be able to govern the country in a new way in the future. And Poland which was earlier a wall between Belarus and Europe wants to become a bridge between them today. But it will not be easy. Poland has no big influence yet in the European Union, and the latter, in its turn, has no consolidated policy towards Belarus. This is why the process of entanglement of Belarus to the European Union's sphere of influence will be, most likely, a very slow one because the unified Europe is a big and heterogeneous structure.

Also, Polish diplomats have no elaborate plan of actions yet in respect of Belarus – it is difficult to fraternize with official Minsk right away! Certainly, any steps forward of the Belarusian authorities will be welcomed: so, Poles are very concerned over the issue of unrecognition by the official authorities of the Union of Poles headed by Angelika Borys. As for the simplification of the visa regime, an important aspect here is the de facto absence of the border between Belarus and Russia.

Also Mr. Kacewicz expressed an interesting opinion that if the trade and economic cooperation alone was established between the West and Belarus in absence of democratic transformations in the Belarusian society it might lead to an era of new isolation and mental alienation: *having a contact in the sphere of economy and trade, the Europeans may discard the thought that Belarus belongs or may belong to Europe.*

The journalist pointed out that *Europe was disappointed in possibilities of the Belarusian opposition* and now, after more than ten years of unsuccessful policy of ignoring the official authorities of the country, the Europeans faced a question: "If we lost so many years in vain, betting on the isolation policy, what should we do with Belarus then? What to do when we support opposition all the time but it gives no result?"

Mr. Eugeniusz Smołar, expert of the European Commission in the matters of the Eastern policy also pointed out that today the European Union simply could not fail to recognize and ignore official Minsk because the latter governed de facto in Belarus. Certainly, cooperation with Belarusian NGOs directed at promoting democratic transformations in the Belarusian society will also be continued.

*If the principled isolation policy collapsed its place is taken now by the pragmatic policy directed at preserving stability in this region and obtaining certain dividends from the economic cooperation.* Realities of the global market are such that Belarus could not exist as an isolated island and its government will have either to sacrifice the independence or to begin the process of democratization which is hazardous for the authorities. If the government of Belarus begins to cooperate with the European Union groups of people will emerge in the Belarusian society which will link their future with Europe.

In this connection, Mr. Smołar stressed that the new EU policy towards Belarus was a gradual lifting of sanctions in exchange for concessions of the Belarusian authorities but not the way of revolution.

Finally, Marek Ostrowski, observer of the influential Polish weekly Polityka, expressed an opinion that Poland, seeking to develop on the Western pattern and having arranged its relations with the powerful neighbor in the west (Germany), had to turn to the east. Certainly, Poles would ideally like to see a powerful neighbor there as well which would push Poland towards positive changes. Anyway, independent of how today's Belarus looks from the point of view of Poles, they have no other options, according to Mr. Ostrowski, but to promote neighborliness and cross-border cooperation with this country.

In the second part of the article you may read about other opinions on the policy of the Eastern Partnership and how Poland benefited from its accession to the European Union.

**Part II**

*Poland became one of the authors of the Eastern Partnership program which provides for the entanglement of Belarus as well as Azerbaijan, Armenia, Georgia, Moldova and Ukraine into the pan-European context of development primarily through the trade and economic cooperation. How do Polish analysts, community leaders and journalists see this process? What did the European Union give to Poland and what can it give to Belarus?*

*Recently a group of Belarusian journalists made a trip to Poland during which Polish politicians, journalists and analysts answered these questions.*

Mr. Ignacy Niemczycki, expert of the department of strategic analysis of the Committee for the European Integration, believes that the reason why Poland turns attention to its eastern borders is that they became the EU border now. The unified Europe, in its turn, should expand its influence in the eastern direction (through the neighborhood policy) in order to neutralize Russia's influence. Certainly, the weakness of the Belarusian opposition has also made Europe look for ways of having working relationship with official Minsk. And the trade and economic cooperation which in the longer term should lead to the country's democratization is seen as the main vector of this working relationship at its initial stage. However, the Belarusian society must be active because Europe can only offer certain opportunities to Belarus.

A similar opinion was expressed by Ireneusz Bil, head of the Foundation of the former Polish president Alaksander Kwaśniewski.

The West came to the conclusion that if it was impossible to bring about revolutionary changes through cooperation with opposition one must go by the evolutionary path: the younger generation of the Belarusian authorities is more oriented to Europe, and it means that in the long term it may change the geopolitical vector of the country.

"We are convinced that democracy cannot be imposed from above, it should ripen on its own in the society", Mr. Bil stressed. Now the West wants to use new instruments in its relations with Belarus and, by doing so, to provide it with new opportunities for democratic changes. The main task of the European Union is to pull Belarus out of Russia's sphere of influence. Anyway, Poles themselves are not yet sure of efficiency of the new policy towards Belarus, because the European Union is rather a big and heterogeneous structure, many member countries of which prefer other projects.

A representative of the Polish Foreign Ministry also spoke about the evolutionary path of cooperation between the European Union and Belarus. According to him, the priority of Europe is to promote the independence of Belarus and stability in the region, and democratic changes come after.

In the past decade the Europeans had time to realize that the policy of isolation was the worst scenario on a par with the incorporation of Belarus into Russia. At the same time, one should not think that the Eastern Partnership is directed against Russia as the future of this country is linked to Europe as well.

And the fact that the European Union allocated comparatively inconsiderable money for the development of relations with Belarus in the framework of the Eastern Partnership means that Europe is interested in this project and ready to expand cooperation provided that there are trends of democratic transformations in Belarus. However, nobody in the West has illusions about feasibility of relatively quick democratic transformation in Belarus.

"Why do Poles kiss hands of a woman? Because one has to start with something", the politician told this joke to show that the Eastern Partnership is also a beginning of a new stage in the pan-European policy.

And a deputy of the Polish Sejm and member of the commission on Belarus told that in the Polish Sejm there is a so called "group of friends of Belarus" (around thirty parliamentarians) which works a lot on the Belarusian issue and would like to see this country in a totally different economic, cultural and political situation. However, the parliamentarian recognized that one had to work a lot and hard in this direction: "There are no simple decisions in the Belarusian issue. The key partner of Europe in relations with this country is primarily young people and intelligentsia, the generation that may change Belarus".

*A lot of attention in our discussions was given to the question what Poland got from its membership in the European Union and what Belarus may get from cooperation with the unified Europe.*

So, Mr. Jarosław Kalinowski, delegate for Belarus' matters in the European Parliament, pointed out that big doubts and fear that the accession to the European Union would lead to an economic disaster did not come true. The opposite happened – Poland got a powerful support in spheres of agriculture, environment protection and preservation of cultural traditions. Moreover, the big advantage is that Europe supports namely the European pattern of the country's development by allocating large subsidies for relevant changes in Poland.

For example, Mr. Juliusz Głuski, press secretary of the EURO-2012 association, which prepares the European soccer championship, told that Poland which was getting ready to receive Euro-2012 together with Ukraine, had got a very powerful impetus to the development of the appropriate infrastructure: construction of new stadiums, training grounds, roads, reconstruction of airports, etc. "We simply must develop rapidly, and Euro-2012 is a sort of whip over us, because we should not bring shame on ourselves in front of everybody", he stressed.

Mr. Dariusz Wojtal, representative of the Polish Chamber for Tourism, described changes in the Polish economy by the example of the tourist industry. It is

interesting that after the Polish accession to the European Union it was the tourism that had the greatest impetus for development, because borders became open and Poland entered the market of Western tour operators. Thus, if in 2004 Egypt, for example, was visited by only 150,000 Poles, in 2008 it was visited by 600,000. Certainly, big investments from the European Union have also contributed to the development of tourism. And today the tourism brings about one third of revenues of the Polish budget – even more than the energy sector does. Naturally, infrastructure is also developing, and now it has to meet the highest requirements. And in general, today Poles attach great importance to how to sell and how to make Poland an attractive destination for tourists.

And Mr. Ignacy Niemczycki identified quite a number of positive changes in Poland after its accession to the European Union:

- GDP growth, because Poland receives big investments from the European Union;
- reduction of unemployment (2003 – 20%, 2008 – 10%) owing to the creation of new jobs and the migration of workforce to EU countries;
- development of tourism (open borders);
- development of system of environmental protection which has to meet the European standards;
- harmonization of legislation;
- changes in mentality – today Poles perceive themselves Europeans to a much greater degree than they did before the accession to the European Union.

A very positive opinion on Poland's accession to the European Union was also expressed by Mariusz Handzlik, adviser of the President of Poland in matters of international relations, who also described very thoroughly the European prospects of Belarus.

Mr. Handzlik said that changes which had taken place in Poland during the last twenty years and especially after its accession to the European Union had surpassed all expectations and attested that decisions which had been taken in 1989 were correct. What Poles see as the best is that they have freedom and possibility to choose and hold their destiny in their own hands.

"The European Union is the best experiment in the world's history, the unique State entity which benefits its citizens as well as the EU member States a lot. But Europe will never be free until it does not express solidarity towards others, and until it does not include countries which now belong to the Eastern Partnership program. We cannot be fully happy until our eastern neighbors are in worse conditions", the Polish diplomat pointed out.

Actually, the Eastern Partnership, according to Mr. Handzlik, should draw the above mentioned countries and the European Union together, and be a bridge between the unified Europe and these countries:

“The Eastern Partnership is a great chance for rapprochement with Europe. At the same time, we understand that it is not a swift-flowing process because even for Poland it took fifteen years to join the European Union. Today we want cooperation, and you may count on our solidarity and assistance. Nevertheless, everything depends on the will of the Belarusian society”.

And Europe expects some steps to meet from Belarus, and namely: liberalization of the electoral legislation, cessation of restriction of the freedom of the mass media and NGOs, market liberalization and economic reforms. In order to begin the rapprochement with the European Union Belarus should first of all join the World Trade Organization. Another very important aspect is unrecognizing of independence of Abkhazia and South Ossetia by Belarus. It is also very important for Poland that the Belarusian authorities stop persecuting the Union of Poles in Belarus headed by Angelika Borys.

At the end, the advisor of Lech Kaczyński suggested that such a powerful structure as the European Union should expand, and it means that political consultations with Belarus would continue: “We use principles of solidarity and democracy, and we want to share all the best Poland has with our neighbors. The Eastern Partnership is in the first place an instrument that helps us to talk to these countries. Integration of Belarus into the European Union and NATO is unavoidable, because there is no future Europe without such States as Belarus, and as those which emerged after the collapse of the Soviet Union”.

*Let us summarize what was said above.*

The main objectives of the Eastern Partnership program are:

- to engage civil societies of the Eastern Partnership countries in the EU sphere (including NGOs, representatives of business, and local authorities) in order to bring these countries to the European Union to a maximum extent;
- integration in different aspects of activities (in the first place, the creation of a common economic space);
- simplification of the visa regime;
- cooperation in the field of energy security and development of energy infrastructure.

What the Eastern Partnership and further cooperation with the European Union may give to Belarus:

- simplified travel of the Belarusian citizens to the EU countries;
- extended cross-border cooperation which contributes to a greater interaction in the economic development and environmental protection;
- backing up of the Belarusian economy, assistance in developing free enterprise and preparation of Belarusian enterprises to their accession to the European market;

– support of programs of the economic and social development of Belarus through the European financial assistance;
– improvement of systems of health protection and education;
– more efficient State and local governance;
– reform of the legal and judicial system in order to secure equal rights for all citizens;
– better economic opportunities for Belarus and improved living conditions for its citizens through the development and modernization of transport and energy systems;
– improvement of the environment: quality of water, waste disposal and support in overcoming the aftermath of the Chernobyl disaster;
– closer dialogue and cooperation with Europe in all other areas.

Thus, the door to the European Union is not shut, and it depends only on us whether we want to enter the house of the unified Europe. Everybody will gain from it.

Аляксандр Класкоўскі

# Як я ледзь не стаў інтэрвентам

29 гадоў таму ў адзін цудоўны жнівеньскі дзень я знянацку апынуўся ў скуры (дакладней – у кірзавых ботах) без пяці хвілін акупанта. Пайшла пагалоска, што наша паднятая па трывозе дывізія ідзе на Польшчу.

Так яно было ці не, схавана пад покрывам вайсковай таямніцы. Найхутчэй што проста адпрацоўваўся манеўр на ўсялякі пажарны (бо страйкавы пажар у суседняй краіне толькі пачынаў разгарацца). Але версія пра «інтэрнацыянальную дапамогу» ўспрымалася на поўным сур’ёзе. Пра забурэнні ў Польшчы шмат гаманілі ў тыя дні «варожыя галасы». Мы патаемна трымалі ў казарме кароткахвалевую «Селену» і менавіта тады пачулі пра Валенсу ды іншых лідэраў страйкавага руху.

…Інтрыга абарвалася, калі непадалёк ад польскай мяжы ахутаную чадам калону так жа раптоўна павярнулі назад. Рэшту збораў мы прабавілі цалкам камфортна. Пераважна ўжывалі чарніла «Абрыкосавы водар» у кустах ля стрэльбішча ды парадыйна спявалі «Красная армия всех сильней».

Пазней я прачытаў, што ў 1980–81 гадах планы інтэрвенцыі сапраўды былі. Роля генерала Ярузельскага трактуецца па-рознаму. Адны сцвярджаюць, што ён сам заклікаў Крэмль увесці войскі, але дзяды з палітбюро ўжо апякліся на Афгане ды баяліся заходніх санкцый, тым часам як цана нафты падала. Іншыя лічаць, што менавіта Ярузельскі, увёўшы вайсковае становішча, уратаваў краіну ад сцэнару Венгрыі-56 ды Чэхаславакіі-68.

Так ці іначай, я ўдзячны лёсу, што гэтая чаша мяне абмінула. Некалі дзядзька Косця, былы танкіст, распавядаў, як іх кінулі ў 1956-м на Будапешт. І хоць асабіста ён нікога не забіваў і не трушчыў тракамі, цяжкі асадак ад таго, як глядзелі мадзьяры на савецкіх салдат, застаўся на ўсё жыццё.

Пасля тых вайсковых збораў 1980-га я стаў пільна сачыць за польскімі падзеямі. Ды і ўся адносна палітызаваная частка беларускага грамадства старалася атрымаць больш адэкватнае ўяўленне пра сітуацыю ў краіне, чым як з артыкулаў у «Правде». На ўсялякіх адзіных палітднях масу таксама грузілі адпаведнай прапагандай: маўляў, узняла галаву контра, пад пагрозай сацыялістычныя заваёвы! Праўда, некаторыя выступоўцы з райкамаў нефармальна дадавалі: ды ў іх там савецкай улады, сапраўднага (як у СССР) сацыялізму і не было ніколі, яны заўжды на Захад, у капіталізм глядзелі!

Зараз раблю выснову, што тыя прапагандысты па-свойму мелі рацыю.

Важны момант: у палякаў за часамі ПНР не паспелі адбіць смак да прыватнай уласнасці. Вёска заставалася пераважна аднаасобнай. Было багата

прыватных крам і г.д. Беларусам жа масава зрабілі калгасную, саўкова-ўтрыманскую прышчэпку. Уся філасофія: рабіць абы з рук ды цягнуць, што кепска ляжыць.

Акрамя таго, многія былі шчыра ўдзячныя савецкаму ладу, перабраўшыся з-пад саламяных стрэх у гарадскія кватэры з цёплымі прыбіральнямі і гарачым душам. З такіх учарашніх вяскоўцаў, што саромеліся «дзеравенскай» мовы, лічы, і склаўся пасляваенны Мінск. На гэтай жа ментальнай глебе, угноенай афіцыйнымі медыямі, пазней вырас недавер абываталя да нацыянальнага дэмакратычнага руху: маўляў, дай ім уладу, дык будуць толькі муштраваць іспытамі на беларускасць!

Мне, зразумела, нагадаюць пра зорныя часы, калі пад апазіцыйныя штандары выходзілі па некалькі дзясяткаў тысяч. Так, але, па-першае, уплыў быў даволі хутка страчаны, а па-другое, і на піку гэтага ўплыву пагроза рэжыму не дасягала такой ступені, каб ён спалохаўся ды згадзіўся на нейкі круглы стол (гульні 2000 года ў «дыялог грамадска-палітычных сіл» не лічым). У Польшчы ж круглы стол стаў вынікам фактычнага парытэту сілаў (і бясспрэчнай маральнай перавагі апазіцыі).

Вядома, у беларускай апазіцыі вялікі рэестр памылак, але ў прынцыпе яна, бадай, проста не магла скочыць вышэй за пояс.

Драма Беларусі – у тым, што камуністычная сістэма даволі паспяхова рэалізавала тут эксперымент па стварэнні «гома саветыкуса».

Таму незалежнасць далёка не ўсе нават асэнсавалі (не толькі ў 1991-м, але і дагэтуль), не кажучы ўжо пра масавае змаганне. І за Лукашэнку ў 1994-м галасавала найперш саветызаваная маса, ахопленая настальгіяй па светлай мінуўшчыне. Культавая кілбаса па 2.20 асацыявалася менавіта з застойным саўком. Адбыўся гістарычны рэванш. Не поўны, і нават хутчэй ілюзорны, але краіна тармазнулася на паўтара дзесяцігоддзі.

Польскія рабацягі таксама хацелі мець кілбасу па даступнай цане. Нагадаю: улетку 1980 года дэтанатарам пратэстаў стала менавіта падаражэнне мяса ў заводскіх сталоўках.

Але феномен «Салідарнасці» палягае зусім не на кілбасных лозунгах. Паролем было слова «свабода».

Зрэшты, і заможнасць, шчодры стол – тая ж сакральная чарка і скварка, калі хочаце – у мільёнаў палякаў эпохі «Салідарнасці» асацыяваліся не з казарменным раем а-ля савок, а наадварот – з дыстанцыяваннем ад Саветаў, з прыватнай ініцыятывай і сапраўднай нацыянальнай незалежнасцю. Ізноў жа – са свабодай.

Беларусы ж тады хоць і былі заінтрыгаваныя дзёрзкасцю Валенсы ды паплечнікаў, размахам польскага руху, але пераважна ўспрымалі гэты феномен як «безумство храбрых», не дапускаючы, што ў «Салідарнасці»

ёсць шанцы на перамогу. І тым болей не праецыравалі падобны сюжэт на БССР. Калос камуністычнай імперыі здаваўся непахісным.

Беларускі соцыум у масе сваёй (прашу асобных пасіянараў тае эпохі не ускокваць з пратэстамі: ніхто не забыты, нішто не забыта) драмаў нават тады, калі затрашчаў па швах увесь «сацыялістычны лагер». Нездарма ж прагрэсіўныя публіцысты называлі самую рахманую савецкую рэспубліку антыперабудовачнай Вандэяй.

На думку палітолага Сяргея Нікалюка, беларусы не маюць традыцыі калектыўнага пратэсту. Зрэшты, тое-сёе можна прыгадаць. І найперш – нечаканы для ўсіх сацыяльны выбух у красавіку 1991-га. Тады ў сталіцы «Вандэі» блізу ста тысяч разгневаных пралетарыяў выйшлі на плошчу Леніна.

Памятаю, як рабацягі перакрывалі трамвайныя пуці ў Мінску. У Оршы ж спынілі нават рух цягнікоў. Зараз натрэніраваныя сілавыя структуры скруцілі б бунтаўнікоў у бараноў рог. Тады, за камуністычным часам, заўважце, гэтакага рэпрэсіўнага апарату, як створаны цяпер, і блізка не было.

Але той бунт быў стыхійны і менавіта каўбасны: абурыла паўлаўскае (па прозвішчы тагачаснага савецкага прэм’ера) павышэнне цэн, калі абед у заводскай сталоўцы замест традыцыйнага рубля стаў каштаваць пад два. Тут – выразная паралель з польскім сюжэтам лета 1980 года.

А вось далей – усё іначай. Не было ідэйнага стрыжня, панавала спантаннасць, таму хваляванні хутка нейтралізавалі, зацягнуўшы ў балота дробязных перамоў і паліятыўных рашэнняў. Пазней некаторыя палітычныя сілы спрабавалі давесці, што накіроўвалі той пралетарскі выступ, аднак ва ўсякім разе відавочна, што прыкметнага ўплыву яны не дамагліся.

Яшчэ адзін усплёск – страйк метрапалітэнаўцаў у 1995 годзе. Але той лакальны імпульсіўны дэмарш быў асуджаны на паразу. Не было рэзанансу, не было шырокай салідарнасці, ужо не кажучы пра моцную структуру кшталту польскай «Салідарнасці». Нагадаю: тая здолела аб’яднаць да 9,5 мільёна чалавек, траціну палякаў!

У гэтым кантэксце варта адзначыць ролю пасіянарнай часткі польскай інтэлігенцыі, якая на пачатку 1980-х здолела ўсталяваць шчыльны кантакт з працоўнай масай.

У польскім выпадку наклаліся два чыннікі. Па-першае, непрыманне камуністычнай сістэмы самой па сабе – як няздольнай забяспечыць дабрабыт, правы і свабоды. Па-другое, непрыманне імперыі КПСС як турмы народаў, прычым не толькі народаў СССР, але і ўсяго сацлагеру. На гэтай платформе стаяла не элітарная купка інтэлектуалаў, а маса палякаў.

Вядома, можна дадаць іншыя важныя чыннікі – у прыватнасці, згадаць пра ролю касцёлу і крылатую фразу Яна Паўла ІІ «Не бойцеся!», паразва-

жаць пра масіраваную заходнюю падтрымку, аднак гэта асобныя шырокія тэмы.

Фактам зьяўляецца тое, што быў трывалы грунт для масавага руху. Палякі стагоддзямі ваявалі за незалежнасць і атрымалі добрую школу. Для іх Масква заўжды асацыявалася з імперскай пагрозай.

Так, і нашы продкі бралі ўдзел у паўстаннях супраць дзвюхгаловага арла. Але потым гэты дух, гэтую гістарычную памяць бязлітасна выбілі рознага кшталту сатрапы.

Ды што там казаць: у нас жа і сёння ладная частка грамадства, як сведчыць незалежная сацыялогія, гатовая ствараць нейкую форму аб'яднання з Расіяй. Яшчэ болей: на далёкіх подступах да новых прэзідэнцкіх выбараў лідэр апазіцыйных камуністаў уздымае на шчыт лозунг адзінай валюты з усходняй суседкай (то бок рубля з дзвюхгаловым арлом). І пэўна ж, разлічвае на спрыяльны рэзананс.

Зрэшты, такія палітычныя піруэты ўжо не выклікаюць апакаліптычных пачуццяў. Тая ж сацыялогія сведчыць, што незалежніцкая свядомасць у нас спакваля мацуецца, гэтак сама як і праеўрапейскія настроі. Яны ўжо нароўні з прарасійскімі, а то і пераважваюць. Дарэчы, пакуль што па большасці найважнейшых для нацыі пытанняў – пытанняў гістарычнага выбару – такі вось хутчэй не парытэт, а раскол. Раскол замест салідарнасці. І тым болей – ніякага намёку на структуру кшталту легендарнай «Салідарнасці».

Відавочна, што беларускі шлях да пераменаў болей пакручасты і супярэчлівы, чым колішні трыумф польскага антыкамуністычнага руху. Зрэшты, заўважым, што імклівая перамога над ранейшым рэжымам не вырашыла праблемаў польскай нацыі цудадзейным чынам. І гэта асобная цікавая тэма.

Не варта ідэалізаваць механізмы. Палітычная культура ў грамадстве напрацоўваецца марудна, спакваля. Рынкавая эканоміка не ёсць гарантыяй райскага жыцця. У Беларусі ж маюцца і спецыфічныя далікатныя праблемы (мова, культурная ідэнтыфікацыя ды іншыя), якія не вырашыць наскокам, дырэктыўна ніякі самы прагрэсіўны ўрад.

Але тэктанічныя зрухі ў нас таксама непазбежныя.

Эканамічны крызіс кідае выклікі, якім няздольная даць рады міфалагізаваная «беларуская мадэль». І ці не галоўны парадокс у тым, што менавіта прывязка да хворай на вялікадзяржаўнасць Расіі, з аднаго боку, і бескампраміснае самаўладства Лукашэнкі, з іншага, стварылі тую грымучую сумесь, што сёння дашчэнту разбурае «саюзны праект» і пакрысе пераводзіць Беларусь у якасна іншую геапалітычную сітуацыю.

У Польшчы былі перамены пад ціскам мас, у нас жа яны наспяваюць пад ціскам вонкавага форс-мажору, «праз не хачу».

Інтэрвенцыя з усходу – практычна нерэальная пагроза для сённяшняй Беларусі, адрозна ад Польшчы перыяду 1980–81 гадоў. Затое імаверная эканамічная экспансія ціхай сапай.

Так што дэкарацыі і акцёры зусім іншыя, інтрыга не такая выразная, а вось момант гістарычнага драматызму для нас наўрад ці значна меншы, чым быў у 1980-х для палякаў.

Aliaksandr Klaskouski

## How I Almost Became an Invader

Развіццё сітуацыі пасля 1991 года прывяло да таго, што грамадству трэба было зрабіць выбар паміж рознымі сістэмамі каардынат, то бок сапраўдны выбар, бо толькі такі выбар, паводле меркавання філосафа Славоя Жыжэка, можна назваць сапраўдным. Вынік такога выбару стаў пэўным індыкатарам сталасці нацыі, яе гатоўнасці прыняць новыя рэаліі. Але ж перад тым, як зрабіць выбар і рухацца далей, трэба разабрацца са сваім мінулым і ўсвядоміць сябе ў ім.

Наколькі большасць беларусаў, якія ў 1991 годзе заставаліся савецкімі людзьмі, былі гатовыя крочыць да новага вымярэння? Пытанне матывацыі да ператварэнняў, на мой погляд, з'яўляецца адным з ключавых для разумення, чаму два суседнія, бадай брацкія народы, звязаныя агульнай (хаця і складанай) гісторыяй, выбралі амаль супрацьлеглыя шляхі сацыяльнай

мадэрнізацыі. Матывацыя складаецца не толькі са стымулаў да пераменаў, але таксама з тых ахвяраў, якія грамадства гатовае прынесці дзеля таго, каб пачаць існаваць у новай прасторы: станоўчы баланс паміж выгодамі і стратамі стае моцным стымулам да актыўнага дзеяння, адмоўны ж ператвараецца часам у непераадольную сцяну на шляху трансфармацыі.

Пра гістарычныя і эканамічныя перадумовы як польскіх рэформаў, так і беларускага феномену ўжо напісана шмат аналітычных артыкулаў, таму рэтрансляцыя тэзісаў пра цывілізацыйны падзел, жалезную заслону, чужароднасць камуністычнага рэжыму, ролю касцёла і асобы Яна Паўла II і шмат пра што яшчэ была б недарэчнай. Варта адзначыць галоўнае: у адрозненне ад беларусаў польскае грамадства аказалася больш матываваным з пэўных гістарычных і палітычных прычынаў.

Камуністычныя ўлады Польшчы былі вымушаны ўзаемадзейнічаць з грамадскай апазіцыяй, якая фарміравалася знізу цягам амаль сарака гадоў. Інакш быць не магло, бо абодва бакі былі як дзве палоўкі яблыка ў адзінай дзяржаве – Польшчы, – існаванне якой ніколі не падлягала сумневу, незалежна ад таго, хто быў ва ўладзе. Сістэма каардынат была адзіная як для ўладаў, так і для шырокай грамадскай апазіцыі, і яна была заданая фактам існавання дзяржавы ў дакамуністычныя часы і адзінага народу ў яе межах. Ахвяраванне недасканалым механізмам рэалізацыі інтарэсаў усіх існуючых у грамадстве групаў ва ўмовах эканамічнага крызісу дзеля новай будучыні не магло стаць трагедыяй, а разглядалася як непазбежнасць. Калі хочаш зрабіць свой дом лепшым, прыгажэйшым і больш камфортным для жыцця, цяжкасці і пакуты, звязаныя з капітальным рамонтам, цябе не напалохаюць.

А вось апазіцыя і ўлады ў Беларусі напачатку ўжо былі падзеленыя, і чым далей ад падзей 1991 года, тым больш. Адзінага яблыка не існавала – былі палоўкі двух розных частак розных цэлых. Улада выйшла з народу, з той большасці, для якой той год стаў сапраўднай трагедыяй, бо іхны дабрабыт наўпрост залежаў ад дзяржавы і яе патэрналізму. А як жа інакш? Дабрабыт – асноўная каштоўнасць для ўцекачоў з беларускай вёскі ў горад, якія пасля «вялікага перасялення народу» ў 1960–70-я з вёсак ў гарады складалі каля 70 % насельніцтва сталіцы і абласных цэнтраў. З'яўленне новай незалежнай беларускай дзяржавы замест СССР пахавала надзеі і тых, хто рыхтаваўся набыць новую машыну, марыў пераехаць з занядбанага напаўразваленага інтэрнату ва ўласную кватэру, і тых, хто нацэліўся на кар'еру ў саюзных партыйна-гаспадарчых органах. Грамадства зрабілася дэзарыентаваным, бо сапсаваўся, а потым знік механізм рэалізацыі ягоных інтарэсаў, які функцыянаваў дзякуючы савецкай дзяржаве. Актыўная ж меншасць была думкамі ў новай еўрапейскай краіне, аднак у такіх умовах забраць уладу проста не здолела дый не змагла б.

У гады БССР усё вырашалася не ў Мінску, а ў Маскве, апошняя давала сваёй заходняй правінцыі ўсё: грошы, статус, надзвычайныя правы «рэспублікі-партызанкі», месца ў ААН. Менавіта ў часы БССР беларусы пераехалі з вёскі ў гарады, ажыццявіўшы мару бацькоў вырвацца з беспрасветнай галечы. Вялікае Княства, Рэч Паспалітая двух народаў, БНР былі адно пустым гукам для тых людзей. Беларусь – малая Радзіма, а вялікая – СССР, і любоў да «малой» Радзімы пачыналася з захаплення і ўдзячнасці «вялікай». Новая дзяржава не выклікала даверу, бо ніхто не меў гарантыяў, што яна забяспечыць усё тое, што калісьці даваў саюзны Цэнтр. «Малая» Радзіма не існавала ў свядомасці асобна ад «вялікай».

Можа, менавіта таму ў галовах беларускіх месцічаў у 1991 годзе ўзнікала пытанне, якое падалося б нонсэнсам для любога ўдзельніка польскага круглага стала: а навошта нам свая дзяржава і якая з яе карысць? Калі звыклая сістэма каардынат пачала знікаць, дэзарыентаваныя беларусы пачалі зноў шукаць, да каго прытуліцца. Матывы да пераменаў не пераважылі страты ад падзення сістэмы. Нацыя, дзяцінства якой прайшло ў БССРаўскіх школах і садках, за якую з маленства плаціў 300-мільённы СССР, апынулася на ростанях, як шаснаццацігадовы маладзён у чужым горадзе пасля заканчэння школы. Страшна, непрыемна і процьма невядомых спакусаў. Маладзён з вёскі не можа жыць у горадзе па вясковых правілах, але трэба ўладкоўвацца і жыць па новых правілах, бо надта ўжо хацелася з той вёскі вырвацца. Як піша беларускі публіцыст Алесь Чобат, «пачаў тады шукаць беларус таго, хто за яго заплаціць, хаця б тую «бяздонную» Расею, а ён ужо адробіць на «панскім двары» ўсё як след альбо паплача і пажаліцца, каб грошай не аддаваць».

Беларусы падтрымалі прапанаваную ім мадэль сацыяльнага кантракту з нованароджанай дзяржавай, якая прапаноўвала працяг «шчасця» пасля «перабудовачнага» перапынку і гарантавала аўтаномнае існаванне, як у вёсцы. Працяг, вядома, быў суцэльнай ілюзіяй, аднак ілюзіі цешылі сэрцы простых людзей, якім надта ўжо не хацелася прачынацца ў суворай і непрыемнай для іх рэальнасці. Вёска, якая пераехала ў чужы для яе горад, вякамі жыла адным днём, бо невядома, што прынясе наступны ранак і які гаспадар зменіць папярэдняга. Сялянская нацыя, якая за некалькі стагоддзяў звыклася туляцца па чужых «радзімах» і «адрабляць паншчыну», аказалася не гатовай самастойна рушыць у дарогу.

Краіна, якая нарадзілася на памежжы дзвюх культур (лацінскай і візантыйскай), народ якой дагэтуль яшчэ не можа вызначыцца, хто ён і якога роду і племені – беларускага, ліцвінскага, тутэйшага, савецкага, рускага, – чакае на свой час. Факт існавання незалежнай дзяржавы калі не зробіць рэвалюцыю ў галовах нашых дзяцей, то, прынамсі, дазволіць наступным

пакаленням аддзяліць савецкую мінуўшчыну ад сучаснасці і пачаць шукаць шляхі для добраўпарадкавання ўжо ўласнага дому, а не сціплай каморкі ў вялікай хаце. Тады і ўзнікне тая адзіная сістэма каардынатаў, у рамках якой улады і тагачасная апазіцыя сядуць за круглы стол, як селі калісьці ў 1989-м «Салідарнасць» і камуністычныя бонзы ў Польшчы, каб дамовіцца пра тое, як жыць далей і ў які бок крочыць. А польскія ўрокі свабоды ўзору 1989 года стануць для беларусаў добрай дапамогай падчас пошуку кампрамісаў і механізмаў іх рэалізацыі.

Frants Charnyshevich

# The Polish Lessons of Liberty

Once during a seminar, dedicated to the Polish experience of political and economic transformations I heard a phrase from a Polish participant that arose a feeling of genuine surprise and even inner protest in the present Belarusians' minds. The phrase was articulated as follows: "These Belarusians are bad students. We've been teaching them how to build democracy and issued a lot of money to them. However, they failed to make a revolution, despite having just the same situation the Poles used to have during the martial law period in Poland." It wasn't so embarrassing to hear the words about "bad students" than to perceive direct comparisons between the current political situation in Belarus and the times of "Salidarnasc" in Poland.

Historical precedents often help to realize the situation. However, sometimes they can seriously disorientate people. It is much easier for the Polish experts and politicians to regard the processes in Belarus trough the prism of the Polish experience in the 1980-ies. Consequently, they work out corresponding recipes for its improvement. However, nobody guarantees that the remedies will be acceptable in the present Belarusian conditions.

The year of 1989 in Poland was the time of dialogues between the opposition and the governmental authorities. The society was looking for the ways out of the political and economic crises. Quite a few Polish experts note that neither of the sides concerned was able to correct the situation on its own.

It wasn't the time of splits. It was the time of dialogues and mutual agreements as well as the time, when the whole Polish nation understood that it was impossible to exist in such conditions further on. There was an absolutely different situation in Belarus then. The Belarusian society got trapped by the economic and political crises after the trouble-free 1980-ies.

The majority of people in Belarus have a very vague notion about the events in Poland in 1989. If you ask my mother, relatives or my friends' relatives about that, most of them will shrug their shoulders, saying: "God knows what was there!" The Polish "round table" as an information event doesn't exist in the majority of my compatriots' memories. They aren't to be blamed for that ignorance, as even close to the end of the Soviet empire; the information flow was restricted and censored if required.

However these people do remember their personal feelings of changes in Poland. Quite a few Belarusians could observe their consequences with their own eyes. Numerous buses with business tourists, organized by the Komsomol and trade union organizations were crossing the Bug River in the western direction in

the autumn of 1989. The economic “shock” after hasty market reforms in the late Soviet period, initiated by the transition government, led by the Polish Prime-Minister Baltserovich’s friend and supporter Yahor Gaydar, made numerous Belarusians take up trans-border trade as a temporary career. The citizens of a newly announced country had an opportunity of evaluating the whole scope of transformations in the Polish society. The range of emotions in relation to Poland astonished. Common people admired and hated Poland at the same time. The Poles were envied and sympathized. The country was surprising and scaring. On the one hand, the people were scared with the misery of pensioners and employees from the closed down industrial enterprises. On the other hand, they were charmed away with colourful boxes on the shelves of stores in Poland. The Belarusians envied the Polish economic miracle and wondered why the Poles got such happiness.

Could the Polish experience of transformations become a catalyst of motivation for social changes in the Belarusian society? The Polish experience gave additional power to the socially active part of society, i.e. the opposition in the broad sense of this word only. The rest of people in Belarus either failed to notice this experience or treated it negatively.

Development of situation after 1991 brought the necessity of making a real choice between different coordinate systems. The result of such a choice was a certain indicator of maturity of Belarusian nation as well as an indicator of its readiness to accept the new realities. However, one should look into the past and find your place in it in order to move further.

The Communist government in Poland was made to cooperate with the civil opposition, formed by the community for almost 40 years in a row. It couldn’t be the other say, as the two parts were in one undivided state of Poland. The system of coordinates was common both for the authorities and broad civil opposition.

The opposition and government in Belarus were divided from the very beginning of independent Belarus and the split broadened with the time passing after 1991. The parts were different elements of different coordinate systems. The authorities represented the majority of common people, who treated that year as a real tragedy as their welfare depended directly on the state and its paternalism. It couldn’t be the other way. Personal welfare was the main value for the people, who fled from the Belarusian villages to cities and towns during the so-called “great migration of people” in the 1960-1970-ies and totaled around 70% of residents in the capital as well as in the regional centers then. The appearance of the new Belarusian independent state instead of the USSR “buried” hopes of those people, who were planning to buy a new car or to move from a rundown hall of residence to a newly-built apartment etc. The society became disorientated, as the tool of putting their interests into life that used to exist due to the Soviet state

broke down and disappeared completely later on. The active minority was dreaming about a new European state. However, it was unable and, logically, failed to seize power in that situation.

All important decisions were taken in Moscow during the time of the BSSR. The Kremlin provided its Western province with everything necessary, including money, its status, its extraordinary rights of "a partisan republic", and its seat at the UNO. It was during the BSSR period of time that the Belarusian people realized the dream of their parents to escape from the world of poverty by means of moving from villages to urban settlements. The Great Duchy of Litva, the Rzecz Pospolita of two peoples, the Belarusian Popular Republic meant nothing to them. Belarus was their "small motherland", while the USSR was their "large Motherland". Consequently, the manifestation of their tender feelings to the "small Motherland" was always starting from manifestation of their admiration and gratefulness to their "large Motherland". The new state didn't evoke trust, as nobody could guarantee that it would ensure everything the Union center used to provide before. The problem was that the "small motherland" didn't exist in the Belarusian people's minds separately from the "large" one.

It might have been due to this problem that the local dwellers had a question that could be treated as nonsense by any participant of the Round Table in Poland. They wondered whether they really needed a state of their own and pondered over its advantages.

As soon as the usual frame of reference was about to disappear, the disoriented Belarusians started to look for anyone to lean against. The arguments for changes didn't prevail over the losses, caused by the system collapse. Being accustomed to getting constant assistance from the Soviet Union structures, the nation appeared at the crossroads.

Belarus is a country at the borderline of Latin and Byzantium cultures. Subject to this peculiarity, quite a few people in Belarus cannot determine their origin nowadays. Some Belarusians note that they are the Soviet people. Others name themselves as Litvins or 'Tuteyshyja' ('People from Here'). Thus, it appears that the nation-building process in Belarus is still in progress. The fact of living in an independent state will help next generations of Belarusians to separate the Soviet past from their modern life and facilitate searches for the ways of arranging the house of their own. As soon as it happens, a completely new frame of reference will appear in Belarus. Consequently, the state authorities and the political opposition will find it possible to sit down around a round table, like it was in Poland in 1989 in order to agree upon the further common strategy of national development. The Polish lessons from the year of 1989 will be highly useful for the Belarusian people at that time, as they will hint about concrete ways of searching for compromises and putting them into life.

Франц Чарнышэвіч

# Цяжкія пошукі

Вераснёўскае нацыянальнае апытанне, зладжанае НІСЭПД, засведчыла даволі нечаканы факт: колькасць прыхільнікаў еўраінтэграцыі перавысіла колькасць энтузіястаў інкарпарацыі ў Расію. Стасунак першых да другіх складае 44 % да 32 %. Беларускія сацыёлагі ды журналісты адразу пачалі шукаць магчымыя версіі зменаў у геапалітычнай свядомасці, аднак, дзякаваць Богу, устрымаліся ад грунтоўных высноваў і доўгатэрміновых прагнозаў, слушна заўважыўшы, што варта пачакаць хаця б да зімы.

Экспертаў не здзіўляе, што паспалітаму беларусу можа прыйсці да галавы жаданне збліжацца з Еўропай, нават пасля прагляду самай аб'ектыўнай у свеце «Панарамы». Дастаткова было знізіць градус нападаў на «заходнія дэмакратыі» ў дзяржаўных СМІ, а кіраўніку дзяржавы заявіць пра жаданне бачыць «сінявокую» еўрапейскай краінай, як адразу грамадская думка стала больш прыязнай да ЕС. Гэта нагадвае вядомы анекдот пра беларуса, які злавіў залатую рыбку, аднак не наважыўся папрасіць чагосьці істотнага для сябе. Калі рыбка здзівілася такім паводзінам свайго візаві, беларус збянтэжана запытаўся: «А што, можна было?»

Геапалітычная свядомасць беларусаў апошнія гадоў дзесяць выявілася надта плыннай. Плыннасць тая вызначаецца бягучай палітычнай сітуацыяй ды настроямі ў дзяржаўных медыях. Газ перакрыюць – пачынаем глядзець на Еўропу, як кот на смятану, дадуць крэдыт – ідзем да братняй Расіі. Аднак не самі па сабе, а толькі пасля «адмашкі» зверху. У грамадстве, як сцвярджае кіраўнік НІСЭПД прафесар Алег Манаеў, яшчэ не існуе грунтоўнай падставы для фарміравання сталых геапалітычных арыентацыяў.

Варта разгледзець змены ў грамадскай думцы праз прызму нядаўніх сустрэчаў групы беларускіх журналістаў з прадстаўнікамі польскага палітычнага класу, зладжаных варшаўскім Цэнтрам міжнародных стасункаў (CSM). Асноўная тэза, якую можна было пачуць з вуснаў амаль усіх польскіх суразмоўцаў: поспех супрацоўніцтва ў рамках «Усходняга партнёрства» залежыць ад жадання саміх беларусаў. Патрыярх польскага супрацыву, эксперт Еўракамісіі ў справах усходняй палітыкі Эўгеніюш Смоляр заявіў наўпрост, што ЕС не будзе нікога «цягнуць за вушы». Жаданне збліжэння мае быць з абодвух бакоў. З беларускага боку высілкаў адной апазіцыі недастаткова, бо, на думку Смоляра, яна не аказвае значнага ўплыву на сітуацыю, не з'яўляецца выразнікам памкненняў вялікай часткі насельніцтва і, такім чынам, не можа лічыцца за стратэгічнага партнёра. А партнёр патрэбны, бо

толькі так можна дамагчыся істотных зменаў ва ўзаемаадносінах Беларусі з еўрапейскай супольнасцю.

Пасля няўдалай палітыкі ізаляцыі, якая, між іншым, прадугледжвала партнёрскую працу менавіта з апазіцыйнымі коламі, польская (ды не толькі, дарэчы, польская) дыпламатыя выглядае разгубленай. На думку Міхала Кацэвіча, аглядальніка з «Newsweek», зараз ідзе пошук новых інструментаў замежнай палітыкі ў дачыненні да Беларусі. У гэтым кантэксце пытанне партнёра ці не самае балючае. Адносіны з прадстаўнікамі Беларусі для польскіх урадавых колаў маральна амаль непрымальныя, бо пасля гадоў канфрантацыі размова нароўні з беларускімі чыноўнікамі выглядае недарэчна, тым больш калі ўлічваць працяг ціску на паплечнікаў Анжалікі Борыс. Аднак якраз вынікі вераснёўскага апытання чарговы раз дэманструюць вялікую ступень уплыву ўладаў на геапалітычную арыентацыю насельніцтва. Сітуацыя патавая, а значыцца, патрабуюцца нестандартныя рашэнні, незалежна ад таго як яны будуць выглядаць з боку еўрапейскіх стандартаў і права.

Вышэйсказанае зусім не азначае, што польскія палітыкі адкідаюць магчымасць далейшага супрацоўніцтва з апазіцыяй. Палітыку робіць актыўная частка насельніцтва, якая часткова належыць да апазіцыі, а дзяржава мае вялізны ўплыў, перад усім, на пасіўную частку электарату. Таму супраца з апазіцыйнымі элітамі будзе працягвацца, хаця б дзеля таго каб схіліць іх да больш прагматычных дзеянняў. Аднак расстаноўка сіл ва ўладных колах цікавіць польскіх дыпламатаў больш, яны шукаюць беларускіх Гарбачовых і Ельцыных, каб пераканацца, што змены, хаця б эвалюцыйныя, магчымыя. Такія асобы і могуць стаць будучымі партнёрамі.

А пакуль атрымліваецца, што самым грунтоўным і надзейным партнёрам для ЕС і ЗША з'яўляецца сам беларускі народ, «крыніца ўлады», як кажа нам Канстытуцыя. З Беларусі ў Брусэль паступаюць сігналы, што гэты самы народ выказаў зацікаўленасць Еўропай. Такія сігналы трэба лавіць і дэманстраваць хуткую рэакцыю, бо можа аказацца, што гэта адзіны ў доўгатэрміновай перспектыве спрыяльны момант для кардынальнай змены сітуацыі, нават калі гэтыя сігналы – вынік маніпуляцый у дзяржаўных СМІ. З такім партнёрам супраца можа грунтавацца адно на шчыльных кантактах, а кантакт з паспалітымі беларусамі можа адбывацца толькі тады, калі яны, жыхары вёсак і малых мястэчак, людзі з рознымі поглядамі і працоўнымі кваліфікацыямі, змогуць без усялякіх перашкодаў праходзіць праз «Шэнгенскі мур», які фатальна аддаліў беларусаў ад Еўропы. Пытанне коштаў і працэдуры атрымання візаў становіцца вырашальным для польскай і еўрапейскай дыпламатый, бо станоўчае рашэнне можа не толькі дазволіць дыпламатам захаваць аблічча, але і вызначыць лёс «беларускага пытання» для Еўропы, не кажучы пра Польшчу, для якой паглынанне Беларусі Расіяй – самы горшы з усіх сцэнараў.

Frants Charnyshevich

# Difficult Quests

A national opinion poll conducted in September by the Independent Institute of Socio-Economic and Political Studies (IISEPS) attested rather an unexpected fact: the number of partisans of the European integration surpassed the number of enthusiasts of the incorporation into Russia. The ratio between the latter and the former is 44% to 32%. Belarusian sociologists and journalists started at once looking for possible versions of these changes in the geopolitical consciousness but, thank God, refrained from deep-routed conclusions and long-term predictions, noting correctly that it would be better to wait at least till winter.

Experts are not surprised by the fact that a common Belarusian may get the idea of desiring a rapprochement with Europe even after having watched "Panarama", the world's most objective news magazine. It was enough to lower the degree of attacks at "Western democracies" in State-controlled mass media, and for the head of State to declare the willingness to see his "blue-eyed country" becoming a European one, as straight off the public opinion got friendlier to the European Union. It reminds a well-known joke about a Belarusian who caught a goldfish but he didn't dare ask something substantial for himself. When the goldfish was astonished at her vis-à-vis' behavior, the Belarusian asked perplexedly: "You mean that I could?"

In the last ten years or so the geopolitical consciousness of Belarusians proved to be too fluctuating. This fluctuation is being determined by the current political situation and attitude in the State media. Gas deliveries have been suspended, and we start gazing at Europe with burning interest; a credit has been issued, and we go to fraternal Russia. However, we do not do it on our own, but only after an approval from above. The head of IISEPS Professor Aleh Manajeu asserts that there is no solid basis yet in the society for shaping constant geopolitical orientations.

It is worth to examine changes in the public opinion through the perspective of recent meetings of a group of Belarusian journalists with representatives of the Polish political class which were organized by the Center for International Relations in Warsaw (CSM). The main message that was articulated by almost all Polish interlocutors – the success of cooperation in the framework of the Eastern Partnership depends on the desire of Belarusians themselves. Eugeniusz Smolar, patriarch of the Polish resistance and expert of the European Commission in matters of the Eastern policy, said directly – the European Union would not tow anyone against his own will. The desire of rapprochement must be expressed by both sides. On the Belarusian side, efforts of opposition alone are not sufficient because, in Smolar's opinion, it has no substantial influence on the situation, does not voice aspirations of the great part of population and, thus, it cannot be regarded as a

strategic partner. And a partner is needed because it is the only way to attain substantial changes in relations between Belarus and the European community.

After the failed policy of isolation which, inter alia, called for a partnership work with opposition circles namely, the Polish (and, in fact, not only Polish) diplomacy looks perplexed. In the opinion of Michal Kacevicz, observer from Newsweek, a quest for new foreign policy instruments in respect of Belarus is now under way. The issue of partner is probably the most delicate one in this context. Relations with representatives of the authorities are almost morally unacceptable for Polish government circles because after years of confrontation a dialogue on equal terms with Belarusian officials looks absurdly, especially if one takes into account the continued pressure on Angelika Borys' supporters. However, it is the results of September poll that demonstrate once again the great degree of influence of the authorities on the geopolitical orientation of population. The stalemate is observed, and it means that unconventional decisions are needed, independently of how they will look from the point of view of the European standards and law.

The foregoing does not mean at all that Polish politicians reject the possibility of further cooperation with opposition. Politics are being done by the active part of population which partly belongs to opposition, and the State has a tremendous influence, primarily, on the passive part of the electorate. This is why the cooperation with opposition elite will go on, at least to persuade them into more pragmatic activities. However, Polish diplomats are more interested by the alignment of forces in government circles; they look for the Belarusian Gorbachevs and Yeltsins in order to assure themselves that changes, at least evolutionary, are possible. Such persons may become future partners.

In the meantime, it turns out that the Belarusian nation itself, the "source of power" as the Constitution provides it, is the most solid and reliable partner for the European Union and the United States. Brussels gets signals from Belarus that this very nation expressed its interest in Europe. Such signals must be caught and a quick reaction must be demonstrated, because it may turn out that it is the only propitious moment in the long-term perspective for a pivotal change in situation, even if these signals are a result of manipulation in the State mass media. The cooperation with such partner may be based on close contacts only, and the contact with common Belarusians may take place only when they, dwellers of villages and small towns, people with different views and professional qualifications, will be able to pass without any obstacles through the "Schengen Wall" that estranged the Belarusians from Europe. The issue of visa fees and procedures becomes a decisive one for the Polish and European diplomacy, because the positive decision may not only allow diplomats to save face, but also to determine the fate of the "Belarusian question" for Europe, not to mention Poland, for which the absorption of Belarus by Russia is the worst-case scenario.

Франц Чарнышэвіч

# Крэсы нашы цяжкія

Гістарычны досвед нацыі – цікавая рэч. Без яго немагчыма збудаваць нацыянальную ідэнтычнасць, асэнсаваць сваё месца і прызначэнне ў часе і прасторы, адначасова гэты досвед можа стаць крыніцай шматлікіх фобій, якія могуць істотна абмежаваць нацыі магчымасці для далейшага развіцця. Беларусы ў гэтым выпадку зусім не выключэнне з правілаў.

Страх уласцівы чалавечай істоце, а значыць, і супольнасцям, у якія аб'ядноўваюцца людзі. Боязь страты назапашаных за доўгія гады рэсурсаў альбо страх быць пазбаўленым сваёй ідэнтычнасці праз чужынцаў спараджаюць у грамадскай свядомасці цэлы шэраг прывідаў, шмат з якіх, як тыя шкілеты ў шафе, хаваліся ў тым самым гістарычным досведзе, бо памяць пра некаторыя пагрозы перадаецца ад пакалення да пакалення.

Некаторыя фобіі ўласцівыя толькі пэўным групам насельніцтва, іншыя працінаюць усе слаі грамадства. Адзін з такіх нашых доўгаграючых агульнанацыянальных прывідаў – «польскае пытанне». На паланафобію хварэюць не толькі лаяльныя да ўлады масквацэнтрычныя славянафілы-ўсходнікі, але і пэўная частка незалежнага грамадства, нават тыя, хто належыць да кола праеўрапейскіх прыхільнікаў беларушчыны і перыядычна карыстаецца дапамогай з польскіх крыніцаў. Змаганне за незалежную еўрапейскую Беларусь дзіўным чынам не замінае ім час ад часу нагадваць сабе і паплечнікам пра «польскую інтрыгу». Недасведчанаму наведвальніку шматлікіх інтэрнэт-форумаў часам можа падацца, што прывід маршалка Пілсудскага лунае недзе побач.

Не мы першыя і не мы апошнія праходзім праз выпрабаванне сваімі суседзямі. Падчас чытання некаторых каментароў у сеціве ўзгадваецца славуты сапёр Водзічка з бессмяротнага раману Гашэка з яго кароннай фразай: «Зусім ты не знаешся, брат, на мадзьярах, колькі разоў я табе гаварыў! З імі трэба вуха трымаць востра». У межах Аўстра-Венгерскай манархіі такое стаўленне да вугорцаў было ўласцівае і для нацыяналістаў-младачэхаў, і для тых, хто шторанку з задавальненнем чытаў «сучку» (так звалася ў народзе галоўная афіцыйная газета імперыі). Тая фобія, між іншым, знікла пасля ўтварэння чэхамі ўласнай дзяржавы – у адрозненне ад паланафобіі, якая працягвае захламляць мазгі нашым грамадзянам пасля 1991 года.

А ці насамрэч палітычныя эліты і паспалітыя грамадзяне Польшчы выношваюць падступныя планы вяртання сваіх былых «крэсаў», нават пасля далучэння да адзінай Еўропы? Падчас нядаўняй сустрэчы беларускіх журналістаў, пераможцаў конкурсу «Польшча 89' – Беларусь 91':

нераўназначныя змены», зладжанай варшаўскім Цэнтрам міжнародных стасункаў (CSM), такое пытанне – з пэўнай доляй іроніі – гучала неаднаразова. І таксама неаднаразова гучаў адказ: сітуацыя выглядае іначай, чым яна бачыцца нам з-за ўсходняй мяжы. Сэнтыменты сэнтыментамі, аднак гэта не больш чым проста размовы: большасць палякаў – простых абывацеляў, палітыкаў, бізнэсоўцаў – свядома арыентаваныя на Захад, а не на Ўсход.

Пэўную ролю адыгрывае таксама гістарычная недасведчанасць маладога пакалення, таго самага пакалення, якому праз 15–20 гадоў будзе належаць краіна. Паводле словаў Марка Астроўскага, аднаго з рэдактараў уплывовага польскага штотыднёвіка «Палітыка», калі выйсці на вуліцы Варшавы альбо якога правінцыяльнага Пацанова і запытацца пра Беларусь і яе гістарычную сувязь с Польшчай, то колькасць абазнаных у гэтым пытанні маладзёнаў можна будзе падлічыць на пальцах.

Паводле словаў тых жа журналістаў «Палітыкі», рух палякаў на Захад у апошнія гады набывае проста паспаліты характар. Гэта не толькі міграцыя ў Брытанію, ЗША або Ірландыю. Польскія грамадзяне літаральна акупуюць памежныя нямецкія дэпрэсіўныя рэгіёны, з якіх у заходнюю частку краіны паўцякала ў некаторых раёнах да 40 адсоткаў працаздольнага насельніцтва. Ну якія там «крэсы», калі ў былых ГДРаўскіх мястэчках можна набыць ахайны нямецкі дамок з кветачкамі па кошце аднапакаёўкі ва Ўроцлаве ці Еленяй Гуры? А месцы шчаслівых уладальнікаў нямецкай нерухомасці займаюць няўдахі з-пад «усходняй сцяны» – так палякі называюць мяжу з Украінай і Беларуссю. Нашыя Брэст і Гродна не маюць нават тэарэтычных перспектыў на якую-колечы міграцыю з Польшчы.

Ампутаваныя ногі і рукі, зразумела, баляць пасля таго, як адпускае наркоз, але ж боль з часам сціхае, і вось нарэшце наступае момант, калі чалавек у пэўны момант забываецца пра адсутнасць той ці іншай канечнасці. Палякам ужо не баліць тая страта, акрамя хіба радыкалаў з маргінальнай Лігі польскіх сем'яў ды сталых слухачоў ультракансэрватыўнага «Радыё Марыі». Таму калі б наша краіна спрасціла для іх да максімуму візавы ды гандлёвы рэжымы, то ніякай «паўзучай экспансіі» на нашыя заходнія вобласці не атрымалася б. А вось з прыбыткам былі б усе. Мясцовыя бюджэты папоўніліся б за кошт настальгічнага і дзелавога турызму, якому менавіта візавы рэжым і замінае. Для паляка, які ўжо забыўся на тое, што падарожжа за мяжу азначае атрыманне візы, адна думка пра паход у беларускую амбасаду адбівае ўсялякую ахвоту выправіцца ў наш бок.

Кожнае чарговае наведванне Польшчы ўзмацняе маё перакананне, што паланафобія – гэта хвароба, ад якой мы, беларусы, церпім цалкам марна, таму што насамрэч нам даўно няма чаго баяцца суворага дзядзькі з вусамі ў чатырохвугольнай фуражцы. Кропкі над «і» ў нашых узаемных з Польшчай

адносінах даўно расстаўлены. Яны ставіліся на працягу ўсёй нашай сумеснай гісторыі, часам – узаемнай крывёй і нянавісцю, часам – непаразуменнем і нежаданнем слухаць адзін аднаго. Магчыма, гэты перыяд абмінуць было нельга. Кожная нацыя, калі паўстае, супрацьпастаўляе сябе суседнім народам згодна з формулай «мы – не яны, яны – не мы, дык хто мы?». Беларусы ведаюць, што яны не палякі і ніколі імі не стануць. Дык дзеля чаго мы працягваем пакутаваць?

Досвед продкаў забяспечыў беларусу добрую прышчэпку ад паланізацыі. Варта прыглядзецца да таго, як ставяцца да гэтага нашыя землякі з Беласточчыны, у якіх нашмат больш прычынаў баяцца страты сваёй ідэнтычнасці. Цікавы факт: падчас апошняга попісу насельцтва ў Польшчы адна грамадская арганізацыя звярнулася з заклікам да прадстаўнікоў нацыянальных меншасцяў запісвацца наступным чынам: «Я украінец – я паляк, я беларус – я паляк, я габрэй – я паляк і г. д.». Шмат хто пагадзіўся, адмовіліся адно беларусы. Адказ быў просты: «Мы гэта ўжо праходзілі», бо формула «gente Lituanus, natione polonus» вядомая беларусам яшчэ з часоў караля Станіслава Панятоўскага.

Відаць, маюць рацыю тыя, хто кажа пра ролю фобій у падтрыманні наяўных у грамадстве інстытутаў і каштоўнасцяў. Расейскі сацыёлаг Гудкоў сцвярджае, што «страх у гэтым выпадку становіцца адным з праяваў больш агульнага механізму негатыўнай ідэнтыфікацыі, сведчаннем упэўненасці ў тым, што нармалёвае жыццё толькі часткова падкантрольна індывіду, што яно можа быць значна горш, чым зараз». Страх перад зманлівай непрадказальнай Прышласцю выклікае жаданне падтрымліваць таго, хто забяспечыць табе перад яе негатыўнымі наступствамі моцную дзяржаву, імператара, «айца народаў» і г. д. Таму жыццяздольнасць беларускай сацыяльнай мадэлі немагчымая без існавання шматлікіх фобій. Знікне страх – знікне і патрэба ў дзяржаўным патранаце. Таму і старалася савецкая (і не толькі) прапаганда падтрымліваць гістарычныя страхі беларусаў на належным узроўні, каб ведалі, хто ў стане абараніць іх ад верагодных «крыважэрных захопнікаў».

Што да палякаў… Мы – не яны, яны – не мы. Кропка пастаўленая. Перазагрузка адносінаў непазбежная. Трэба толькі быць гатовымі да яе ды не сапсаваць момант няўклюднымі фобіямі, бо чым іх менш, тым больш мы нацыя.

Frants Charnyshevich

# Our Difficult Lands

The historical experience of a nation is an interesting thing. It is impossible to build the national identity and to comprehend your place and purpose in space and time without it. At the same time this experience may become a source of many phobias which can significantly limit nation's opportunities for further development. Belarusians are not an exception to the rule in this case.

Fear is proper to the human being, as well as to communities in which people unite. Fear to lose resources accumulated over long years or fear to be stripped of one's own identity by foreigners generates a number of ghosts in public mind, many of which, as this skeleton in the closet, hid in the same historical experience because memory about some threats is passed on from generation to generation.

Some phobias are proper to some groups of population only; others penetrate all strata of the society. One of our long-playing nationwide ghosts is the "Polish issue". Not only Moscow-oriented and loyal to the authorities Slavophils-easterners suffer from polonophobia, but also some part of the independent society, even those who belong to Europe-oriented supporters of the Belarusian language and culture and periodically receive support from Polish sources. The struggle for the independent European Belarus in a remarkable way does not preclude them from reminding to themselves and their fellows from time to time about the "Polish intrigue". Inexperienced visitor of many Internet-forums may believe sometimes that the ghost of Marshal Piłsudski planes somewhere nearby.

We are neither the first ones nor the last ones to go through testing by our neighbors. When I read some comments on the Net I remembered the famous sapper Vodicka from the immortal novel by Hašek with his star sentence: "You do not know Magyars at all, bro, how many times I have told you this! You must keep your eyes open with them." Within the Austro-Hungarian Empire such attitude towards Hungarians was proper for nationalists-mladocechy as well as for those who every morning was reading with pleasure the "gip" – this is how the main official newspaper of the empire was called among the people. That phobia, i.a., disappeared after the Czechs created their own State, unlike polonophobia which continues to clutter up the brains of our citizens after 1991.

Do political elites and common citizens of Poland indeed nurture wicked designs of returning their former "kresy", even after having joined the united Europe? During the recent meeting of Belarusian journalists – winners of the contest "Poland 89 – Belarus 91: inequivalent changes" organized by the Warsaw Center for International Relations (CSM) this question – with some dose of irony – was asked on repeated occasions. And the answer was given repeatedly

as well: the situation differs from how we see it from the other side of the eastern border. Sentiments are sentiments, but they are nothing more than mere words: the majority of Poles – common men of the street, politicians, and businessmen – are knowingly oriented towards the West, and not the East.

A certain role is also played by historic ignorance of the young generation, the very generation that will possess the country in fifteen to twenty years. According to Marek Ostrowski, one of the editors of the influential Polish weekly Polityka, if one goes out to the streets of Warsaw or a provincial town like Pacanów and asks about Belarus and its historic connections with Poland, only a handful of young people will have a good grasp of it.

In the opinion of Polityka's journalists, in the last years the movement of Poles to the West assumes a really popular character. It is not merely the migration to the Great Britain, the United States or Ireland. Polish citizens literally occupy depressive near-border German regions, some areas of which were abandoned in favor of the western part of the country by up to forty per cent of the working-age population. "Kresy" is nothing when in former GDR towns one can buy an accurate German house with flowers at the price of a one-room apartment in Wroclaw or Zielona Góra. And places of fortunate owners of German real estate are taken by unlucky fellows from near the "eastern wall" – this is how the border with Ukraine and Belarus is called by Poles. Our Brest and Hrodna do not have even theoretical prospects for any migration from Poland.

Amputated legs and hands surely ache after anesthesia goes away but the pain passes off over time and finally a moment comes when the person forgets at one point the absence of one or another extremity. Poles do not feel the pain of that loss anymore, probably with exception of radicals from the marginal League of Polish Families or regular listeners of the ultraconservative Radio Maryja. This is why if our country simplifies the visa and trade regimes to the maximum extent no "creeping expansion" to our western regions would happen. But everybody would be with profit. Local budgets would be replenished due to nostalgic and business tourism which is impeded by the visa regime. For a Pole who forgot already that a travel abroad means getting a visa the only thought about a visit to the Belarusian Embassy is discouraging from traveling in our direction.

Every subsequent visit to Poland strengthen me in my conviction that the polonophobia is an illness from which we, Belarusians, suffer totally in vain because, in fact, long since we do not have to be afraid of a harsh mustached man in the quadrangular cap. All the T's were crossed long time ago in our relations with Poland. They were crossed during all our common history, sometimes by mutual blood and hatred, sometimes by miscommunication and unwillingness to listen to one another. Probably it was impossible to get round this period. Every nation, when it is being formed, opposes itself to the neighboring nation according to

the formula “we are not them, they are not us, so who are we?” Belarusians know that they are not Poles and will never become them. So what do we continue to suffer for?

The experience of ancestors inoculated Belarusians well against Polonization. It is worth to have a closer look at how our compatriots from Białystok region, who have many more reasons to fear the loss of their identity, feel about it. An interesting fact: during the last population census a civil organization appealed representatives of national minorities to get registered in the following way: “I am Ukrainian – I am Pole, I am Belarusian – I am Pole, I am Jewish – I am Pole, etc.” Many agreed, only Belarusians refused. Their answer was simple: “We’ve been there already”, because the formula “gente Lituanus, natione polonus” is known to Belarusians since the times of King Stanisław Poniatowski.

Probably, right are those who speak about the role of phobias in sustaining institutes and values which are present in the society. The Russian sociologist Gudkov reaffirms that “fear in this case becomes one of the manifestations of a more general mechanism of the negative self-identification, an evidence of conviction in the idea that a normal life is only partly controlled by an individual, that it can be much worse than now”. Fear of a deceptive unpredictable Future provokes a desire to support the one who will secure you against its negative consequences – the mighty State, the emperor, the “father of nations”, etc. This is why resiliency of the Belarusian social model is impossible without existence of numerous phobias. When fear disappears, the need in the State patronage disappears as well. This is why the Soviet (and not only Soviet) propaganda tried to sustain historic fears of Belarusians on the adequate level, so that they knew who was able to protect them from potential “bloodthirsty invaders”.

As for Poles… We are not them, and they are not us. The T has been crossed. The reboot of relations is inevitable. We only have to be ready for it, and not to spoil the moment by awkward phobias, because less we have them, more we are a nation.

Роман Яковлевский

# Белорусские еврореалисты

Внутрибелорусская дискуссия на тему светлого будущего страны, о необходимости которого так долго говорили местные демократы, судя по всему, началась. И стимулировали ее своим поведением, чтобы кто ни говорил, не власть имущие и другие, а пришлые еврооптимисты из разных структур. Они уверяют, что ждут возвращения Беларуси в Европу, и предлагают для этого инструмент в виде программы «Восточное партнерство». Приступ интереса еврооптимистов к суверенной Беларуси странным образом совпал с откровениями некоторых евроскептиков.

«Евросоюз превратился в недемократическую структуру, которую можно сравнить с коммунистическими режимами Восточной Европы, запрещавшими свободу выбора», – с таким резким заявлением выступил в Европарламенте президент Чехии Вацлав Клаус. Он также сравнил ЕС с бывшим СССР. Как известно, с января 2009 года Чехия является страной, председательствующей в Евросоюзе. По словам Клауса, параллель между ЕС и СССР заключается в том, что страны ЕС, как в свое время республики СССР, передают часть своих полномочий союзным органам и признают прямое действие наднационального законодательства в рамках своих юрисдикций.

Интересно, что на подобные темы иногда не против поговорить и строители малопонятного для bon sens Союзного государства. Тем не менее, обе его части также сегодня переживают тяжелые последствия мирового кризиса. И не всегда наблюдается согласие между официальными Минском и Москвой. К примеру, спорным остается вопрос введения единой валюты.

